Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрэсу: іншагародзям — 20 к. місцовым — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрэлі пасьля тэксту 1 р. — к. За радок капітэрэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнным на 50 проц. карацей. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. надлішку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 коп. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрадоўж. і чарговазарміўным за радок . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 26 (2515) Нядзеля, 3-га лютага 1929 г.

XII ЗЬЕЗД КП(б)Б АДЧЫНЯЕЦЦА 5-ГА ЛЮТАГА 1929 Г. А 6-й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ У ПАМЯШКАНЬНІ КЛЮБУ КАРЛА МАРКСА З НАСТУПНАЙ ПАВЕСТКАЙ ДНЮ.

1) СПРАВАЗДАЧА ЦК КП(б)Б (ДАКЛ. ТАВ. ГАМАРНІК).
2) ДАКЛАД РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ (ДАКЛ. ТАВ. КРОЛЬ).
3) СПРАВАЗДАЧА ЦКК КП(б)Б (ДАКЛ. ТАВ. КАЛНІН).
4) 5-ЦІ ГАДОВЫ ПЛЯН РАЗЬВІЦЬЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР (ДАКЛ. ТАВ. ГАЛАДЗЕД, КАРКЛІН).
5) АБ ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ У ПАРТЫЮ, РЭГУЛЯВАНЬНІ РОСТУ І ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ (ДАКЛ. ТАВ. ВАСІЛЕВІЧ).
6) АБ РАБОЦЕ ПРАФСАЮЗАЎ, (ДАКЛ. ТАВ. РЫКОЎ).
7) ВЫБАРЫ.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГАМАРНІК.

Крэдыты для СССР у Аўстрыі.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ВЕНСКІХ ДЗЕЛАВІНОЎ ДА ГАНДЛЮ З СССР.

ВЕНА, 1-II. Водлуг афіцыйных матар ялаў венскага муніцыпалітэту, з першае раты гарантыйных крэдытаў для экспарту ў СССР, у разьмеры 60 міліёнаў шылінгаў (аўстрыйскі шылінг — блізка 28-мі кап.), выкарыстана да сканчэньня тэрміну (31-га студзеня) 50 міліёнаў. Некаторыя прамыслоўцы зьвярнуліся ў муніцыпалітэт з просьбаю прадоўжыць тэрмін выкарыстаньня рэшты першае раты крэдытаў і другое раты ў 40 міліёнаў шылінгаў. Такая-ж прапанова пададзена гэтымі днямі саюзам заводчыкаў машынабудаўнічае прамысловасьці, электрапрамысловасьці і саюзам рабочых мэталёўцаў.

Водлуг вестак «Арбэйтэр Цэйтунг», муніцыпалітэт паведаміў саюз мэталёўцаў, што перамовы аб гэтым праводзяцца, і пытаньне павінна высьветліцца да 15-га лютага. Муніцыпалітэт намеран ізноў гарантаваць крэдыт у 100 міліёнаў шылінгаў *(28 міліёнаў рублёў). Пасьля сканчэньня адпаведных перамоў у муніцыпалітэт будзе пададзен законапраэкт наконт гэтага.*

Падзяка макданальдаўцам ад кансэрватыўнага міністра

ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЕ ПРАГРАМЫ АНГЕЛЬСКАЕ БУРЖУАЗЕІ.

ЛЁНДАН, 1-II. Марскі міністр Брыджмэн у сваім выступленьні ў кансэрватуцыйным клюбе ў Лёндане заявіў: «У справе скарачэньня ўзброеньняў Англія зрабіла больш чымся прыпадала на яе долю. Заваяваньне, нібыта Англія распачала гонку з пабудовай крэйсараў у 10 тысяч тон, не адпавядае сапраўднасьці: вашынгтонская канфэрэнцыя ўст навіла вельмі высокі ўзровень ўзброеньняў на моры, з прычыны чаго максімум стаў нормаю. Англіі давялося найсьці на прыкладзе іншых дзяржаў, але мінула два ці тры гады, пакуль у Англіі былі закладзены новыя крэйсары водлуг загаду ураду рабочае партыі, а гэта робіць яму гонар. Што-ж датычыць амэрыканскага законапраэкту аб пабудове крэйсараў, дык Англіі няма дзеля чаго ўмешвацца ў гэтае пытаньне. Існуе пакт Келёга, і я думаю, што ўсе нацыі, якія яго падпісалі, намераны яго выконваць. Я ня збіраюся крытыкаваць колькасьць і разьмеры ўсяго, што Амэрыка палічыць неабходным для сябе, і лічу лепшым не дамагацца ад яе ніякіх дакладных фармулёвак. На мой погляд, міжнародны спакой будзе ў большай бэзапаснасьці, калі будзе знаходзіцца ў руках краёў, прасякнутых удзячным даверэм адзін да аднаго чымся на ўсіх іншых руках».

НАСТОЯЙНЫЯ ГАЛАСЫ Ў АНГЛІІ ЗА ЗНОСІНЫ З СССР.

ЛЁНДАН, 31-I. «Дэйлі Экспрэс» у перадавіцы настойвае ўжыць захады, каб адновіць англа савецкія дачыненьні. Газэта заяўляе: «Новы ўрад павінен будзе адновіць зносіны з СССР, і з гэтае прычыны мудры кансэрватызм не павінен быў-бы чакаць моманту, калі ён будзе пастаўлен перад няўхільнасьцю».

АЛІ АХМЭД-ХАН У 17-ці ВЯРСТОХ АД КАБУЛУ.

КУГІСТАНСКІ ЗАСЛОН РАЗЬБІТЫ.

КАБУЛ, 31-I. Водлуг апошніх вестак, вёска Будхак захоплена часьцямі Алі Ахмэд-хана. Кугістанцы адступілі з вялікімі стратамі.

Сярод жыхарства Кабулу панураецца варожасьць да кугістанцаў. Крамы зачыненыя. Адчуваецца востры недахон харчоў. Штодзённа ўчыняюцца шматлікія арышты сярод прыхільнікаў падышаха Амануллы і Алі Ахмэд-хана.

КУГІСТАНЦЫ РАБУЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ.

КАБУЛ, 30-1. Наступ на Кабул джалалабадзкае групы пляменьняў, на чале якіх стаіць Алі Ахмэд-хан, затрымаўся в прычыны вялікага сьнегу. Адтак, авангарды джалалабадцаў падышлі да вёскі Будхак (17 кілёмэтраў на ўсход ад Кабулу). Кугістанцы мелі ў бойках пад Будхакам вялікія страты; гэта выклікала сярод іх перапуд. Абвешчаная ў Кабуле Бачэ-Сакао набліжэньне праходзіць слаба. Пачашчаюцца выпадкі дэзэртырства кугістанцаў. Уночы з Кабулу часткова вывозяцца каштоўнасьці і зброя ў бок Кугістану.

ЧУТКІ АБ АДЛЁЦЕ БАЧЭ-САКАО З КАБУЛУ НЕ ПАЦЬВЕРДЗІЛІСЯ.

ЛЁНДАН, 1-2. Газэта «Дэйлі Тэлеграф» паведаміла, што чуткі, нібыта Бачэ-Сакао хоча выехаць з Кабулу і паляцець у Пешавар в першым англійскім самалёце, не пацьвердзіліся.

АЛІ АХМЭД-ХАН НЯ ВОРАГ АМАНУЛЕ.

КАБУЛ, 30-1. Алі Ахмэд-хан, які знаходзіцца на чале наступаючае на Кабул джалалабадзкае групы пляменьняў і рыхтуецца да захопу сталіцы, заявіў, што ён не зьяўляецца ворагам старое дынастыі і, між іншым, падышаха Амануллы.

НАША ПРАПАНОВА ЛАТВІІ І ЭСТОНІІ

ДАЛУЧЫЦЦА ДА МІРНАГА ПРАТАКОЛУ, ПРАПАНАВАНАГА ПОЛЬШЧЫ.

* * *

РЫГА, 31-1. Водлуг паведамленьня друку, паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Рызе перадало латвійскаму міністэрству замежных спраў прачанову наконт далучэньня Латвіі да пратаколу аб неадкладным наданьні правамоцнасьці пакту Келёга.

РЭВЕЛЬ, 1-1. Газэты паведамляюць, што савецкі паўнамоцны прадстаўнік у Рэвелі т. Пятроўскі паведаў эстонскага міністра замежных спраў Ластыка «для выяўленьня адносін Эстоніі да пакту Келёга і да пратаколу, прапанаванага СССР». Водлуг слоў газэты, паўнамоцны прадстаўнік перадаў Ластыку для інфармацыі копію праэкту пратаколу, але не зрабіў непасрэднае прапановы аб далучэньні Эстоніі да пратаколу. Газэта «Пяевалехт» пры гэтым заўважае, што такая прапанова была, аднак, зроблена савецкім паўнамоцным прадстаўніком у Рызе латвійскаму ураду. Водлуг вестак газэты «Ваба Маа», Ластык заявіў, што Эстонія «жадае, каб пратакол быў шматбаковым, з удзелам усіх прыбалтыцкіх дзяржаў, і гатова ўдзельнічаць у перамовах, калі зьмест пратаколу і тлумачэньне яго будуць выразнымі і пажаданымі для яе».

ЗАМЕТКА: Водлуг вестак, атрыманых ТАСС, крокі, ужытыя савецкімі паўнамоцнымі прадстаўнікамі ў Рэвелі і Рызе, мелі, не зважаючы на заявы „Пяевалехт", адзінакавы характар.

Арыентацыя Прыбалтыкі ў бок Польшчы.

КОЎНЯ, 1-2. Афіцыёз «Летувос Айдас» сьц вярджае, што адказы Эстоніі і Латвіі на прапанову далучыцца да пратаколу, прапанаванага СССР, выкрываюць палітычную арыентацыю гэтых дзяржаў у бок Польшчы.

ПОЛЬШЧА БЛЫТАЕ ФАКТЫ ДЗЕЛЯ ПЭЎНЫХ МЭТ

РЫГА, 1-II. Газэта «Янукас Зініяс» абвяргаючы польска-савецкія перамовы аб паданьні правамоцнасьці пакту Келёга, піша: „Наш спэцыяльны карэспандэнт у Рэвелі паведамляе, што у эстонскіх палітычных колах зьдзіўлены адказам Польшчы Савецкаму Саюзу. Польскі ўрад у сваім адказе заўважае, нібыта Эстонія і Латвія выказалі жаданьне падпісаць літвінаўскі пратакол супольна з Польшчаю. У эстонскіх палітычных колах не разумеюць, аднак, чаму Польшча жадае хавацца за сьпіною Эстоніі і Латвіі. Не Эстонія і Латвія зварочваліся да Польшчы з прапановаю супольна падпісаць пратакол, але якраз наадварот, —гэтая прапанова была зроблена Польшчаю. Прынамсі, эстонскі міністр замежных спраў атрымаў такія запросіны ад польскага ўраду».

Як спаткана ў Польшчы прапанова Літвінава.

ВАРШАВА, 1-II. Польскі друк зьмяшчае паведамленьне ТАСС аб ходзе перамоў Літвінава з Патэкам наконт парадку падпісаньня пратаколу аб неадкладным наданьні правамоцнасьці пакту Келёга. Паведамленьне выклікае вялікую цікавасьць у польскіх і чужаземных колах.

У міністэрстве замежных спраў чужаземным карэспандэнтам заявілі, што польскія аўтарытэтныя колы здаволены праэктам супольнага падпісаньня пратаколу Польшчай, Латвіяй, Эстоніяй і Румыніяй у Маскве.

Пакт Келёга ў латвійскім сойме.

РЫГА, 1-II. Латвійскі ўрад падае сойму на ратыфікацыю пакт Келёга.

ВОДГУКІ Ў БЭРЛІНЕ НА АПОШНЮЮ ПРАПАНОВУ ЛІТВІНАВА.

БЭРЛІН, 1-11. Нямецкі друк аддае шмат увагі прапанове Літвінава да Польшчы наконт часу падпісаньня пратаколу і разглядае яе, як доказ жаданьня СССР унесьці поўную выразнасьць у польска-савецкія дачыненьні і намеры абодных краёў.

НЯЎДАЧНАЯ СПРОБА ПЕРАВАРОТУ Ў ГІШПАНІІ.

ПАРЫЖ, 1-II. Вестак аб падзеях у Гішпаніі як і раней амаль-што няма. Аднак, можна меркаваць, што спроба паўстаньня канчаткова ліквідавана. Ваенны суд распачаў разгляд справы арыштаваных 40 афіцэраў і 200 радавых. Тры афіцэры засуджаны да кары сьмерці. Аднак, прысуд ня выкананы, бо, як відаць, урад канчаткова ня вольнае, што зробіць са зможнымі. Учарайшае паведамленьне, нібыта ў розных гарадох Гішпаніі выбухнулі забастоўкі, не пацьвярджаецца, хоць напярэдадні паўстаньня намячалася значнае ажыўленьне забастовачнага руху ў прамысловых цэнтрах Каталёніі і Абсуры.

Французкі лібэральны друк, абмяркоўваючы падзеі ў Гішпаніі, адзначае, што проціўрадавы рух пацярпеў няўдачу, бо ня здолеў забясьпечыць сабе шырокага грамадзкага падтрыманьня.

У Саюзе ССР.

У МАСКВУ ПЕРАВЕЗЕН ПРАХ ГІББЭНА.

ГІББЭН—АДДАНЫ ПРЫЯЦЕЛЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

МАСКВА. 2-га лютага ў Маскву прыяжджае урна з прахам вядомага амэрыканскага грамадзкага дзеяча і журналіста Пакстона Гіббэна.

Гіббэн быў адным з самых буйных журналістаў капіталістычнае Амэрыкі; ён заваяваў сабе вядомасьць сваімі выступленьнямі за прызнаньне Злучанымі Штатамі Савецкага Саюзу і супольнае культурнае і эканамічнае збліжэньне гэтых двух краёў. Выдатны журналіст, ён здольна і нясупынна вяў тую кампанію маны і палавы, якая праводзілася амэрыканскаю буржуазнаю прасаю ад самага пачатку Кастрычніцкае рэвалюцыі. Сваёю палемікаю з ворагамі СССР і камуністаў за прызнаньне Савецкага Саюзу ён узьняў проці сябе амаль-што ўвесь прасы амэрыканскі рэакцыйны друк. Журналістская дзейнасьць Пакстона Гіббэна адыграла вялікую ролю ў справе прыцягненьня грамадзкае ўвагі Амэрыкі да СССР.

Перад сьмерцю Гіббэн наказаў пакаваць яго ў Маскве; гэтае пажаданьне зрабіла вялікае ўражаньне ў грамадзкіх колах Амэрыкі.

На 7-мігадзінны дзень.

РАСТОЎ-ДОН, 1-II. З сёньнешняга дня Вазьнясенскія нафтавыя прамыслы Грознафты перайшлі на 7-мігадзінны працоўны дзень.

Перасяленчы плян на 1928-29 г.

МАСКВА. Савет Працы і Абароны прызнаў, што ў 1928-29 годзе павінна быць перасялена і гаспадарча ўпарадкавана 21.000 перасяленцаў, а таксама падрыхтаваны і размеркаваны ўчасткі, патрэбныя для заселенньня на той год 119.800 перасяленцаў. Апроч таго, абавязкова павінна быць скончана праца ў галіне абвадненьня перасяленчых вучасткаў, заселеных летась у Сярэднім і Нізкім Паволжжы, а таксама ў Троіцкай і Ірбіцкай акругах Уральскае вобласьці. Галоўнаму перасяленчаму камітэту даручана правесьці абследаваньне, каб вызначыць перасяленчыя фонды ў Бурата-Мангольскай і Якуцкай рэспубліках.

Савет Працы і Абароны абавязаў усе органы, якія маюць дачыненьне да перасяленьня, найшырэй спрыяць калектыўнасьці перасяленчых гаспадарак і замацаваць за імі на менш 15-ці проц. падрыхтоўчых фондаў.

Паскораны тэмп марскога суднабудаўніцтва.

МАСКВА. Народны Камісар Шляхаў т. Рудзутак зьвярнуўся да Куйбышава, Мікояна і Арджанікідзе з лістом, у якім зазначае, што трэба паскорыць тэмп марскога суднабудаўніцтва. Тав. Рудзутак просіць ужыць захады, каб тэмп пабудовы суднаў на заводах быў значна паскоран у адпаведнасьці з патрэбамі марскога транспарту СССР.

Камісія тав. Сольца на Паўночным Каўказе.

КРАСНАДАР, 1-II. Камісія ЦКК РСІ пад старшынствам тав. Сольца, якая наведала Краснадар, разгледзела больш 500 скаргаў і выказала з папраўчага дому 117 чалавек. Апроч таго, камісія выказала з-над партыі і прыняла на прымусовую працу 108 чалавек.

Тав. Сольц выступіў з вялікім дакладам—аб задачах сацыялістычнага будаўніцтва—на партыйным сходзе. Ён таксама наведаў станіцу Клізавецінскую дзе прысутнічаў на перавыбарах саветаў і гутарыў з хлебаробамі. Сёньня камісія выехала ў Новарасейск.

Абвадненьне Сальскага стэпу.

РАСТОЎ-ДОН, 1-II. Наркамзем зацьвердзіў праэкт абвадненьня Сальскага стэпу. Праэкт прадугледжвае зрабіць па ўсёй даліне рэчкі Сах глыбокія ліманы праз пабудову заставак. Будзе зроблена 19 ліманаў. Даўжыня ўсіх ліманаў у сярэднім дасягне 10-ці кілёмэтраў, а даўжыня некаторых заставак—6-7 кілёмэтраў. Такіх заставак будзе абведзена 82 тысячы гэктараў засушлівае зямлі. Кошт працы мяркуецца ў 10 міліёнаў рублёў. Жэлета распачнецца пабудова двух заставак.

Каапэрацыйныя драпежнікі.

ПЕТРАЗАВОДЗК, 1-II. ДПУ Карэліі выкрыла ў Петразаводску гняздо каапэрацыйных драпежнікаў. Загадчыкі крам і прадаўцы начале з праўленьнем петразаводзкага ЦРК систэматычна кралі каапэрацыйныя сродкі і тавары і паладзілі між сабою шчыльную сяйку. Раскрадзена тавараў на 20 тысяч рублёў. Арыштаваны увесь склад праўленьня. Абвінавачана 36 асоб. Дазнаньне скончана. Хутка віноватыя будуць адказваць перад судом Карэліі.

МОЦНЫ ЗЕМЛЯЗДРЫГ У СЯРЭДНЯЙ АЗІІ.

ТАШКЕНТ, 2-2. 1-га лютага а 10-й гадз. увечары ў Ташкенце адчуваўся земляздрыг сілаю ў 4 балы. Водлуг даных сейсьмічнае станцыі, цэнтр земляздрыгу знаходзіцца каля Кулябы (Таджыкістан). Земляздрыг цягнуўся 2 хвіліны і быў мацнейшым у напрамку на Манганоказа. Сіла ўчарайшага земляздрыгу ў цэнтры дасягала 8 балаў. Водлуг мяркаваньня сейсмолёгаў у заходнім Таджыкістане магло быць зруйнавана некаторыя пішчыкі. Глеба вагалася на працягу 4-х гадзін.

КАКАНД. 1-га лютага а 10-й гадз. увечары адчуваўся земляздрыг. Хвалістае ваганьне глебы, якое скончылася штуршком у 3 балы, цягнулася на працягу 20-ці секунд.

САМАРКАНД. 1-га лютага а 10-й з паловаю гадз. увечары ў горадзе адчуваўся даволі моцны земляздрыг. Земляздрыг меў характ р мяккіх ваганьняў глебы, якія цягнуліся 15-20 секунд. З прычыны мяккасьці ваганьняў нічога не зруйнавана; аднак, у будынках спіданіов з паліц рэчы.

УРАДУ ТАНАКА

ўдалося ўхіліцца ад адстаўкі

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ГРАМАДЗКАСЬЦІ—ВАРУНКІ ЗАБОЙСТВА ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНА.

ТОКІЁ, 1-II. Учора ўвечары агульнапартыйная Міносэйто прапанавала ў парляманце рэзалюцыю, каб урад агалосіў вынікі расьледаваньня наконт выбуху поезду Чжан-Цзо-Ліна. Рэзалюцыя адхілена большасьцю 220-ці галасоў проці 198-мі. Вынікі галасаваньня цікавыя, бо яны сьведчаць, што ўрад мае пакуль-што значную большасьць.

* * *

ТОКІЁ. Газэта „Осака Майнічі" абмяркоўваючы ў перадавіцы парляманцкія выступленьні наконт варункаў замаху на жыцьцё Чжан-Цзо-Ліна, заўважае, што японская грамадзкая думка патрабуе выразнасьці ў гэтым пытаньні. Урад павінен расьледаваць гэтую справу, і калі некаторыя японцы будуць замешаны ў гэтым, дык урад павінен будзе адважна выявіць усе факты, якія пацьвярджаюць, што ўсё адбылася проці жаданьня Японіі.

* * *

ТОКІЁ, 1-II. Учора на пасяджэньні бюджэтнае камісіі ніжняе палаты, дэпутат народна-сацыяльнае партыі Камэі запытаў, ці ўжыў урад якіх-небудзь пакараючыя меры пасьля таго, як японская місія ў Пекіне паведаміла яго, што на поезд Чжан-Цзо-Ліна рыхтуецца замах. Прэмэр Танака адказаў, што такога паведамленьня ад місіі ня было. Калі ж дамагаўся свайго і выкінуў адказу ад вып. міністра замежных спраў Моры, які заявіў, што ня можа нічога сказаць аб гэтым.

ЛІДЭРЫ „МАСАВАЕ ПАРТЫІ" ПАДКУПЛЕНЫ ЎРАДАМ.

ТОКІЁ, 1-II. „Кокумін" і інш. газэты паведамляюць, што ў Ніхонтай-Сэйто (японская масавая партыя), засавацца пагадзка пра злучэньне некалькіх рабочых і сялянскіх партый) выбухнулі розгалосьсі. Яны выкліканы выкрыцьцямі, што генэральны сэкратар партыі Хірано, лідэр цэнтравых элементаў Азо і іншыя дзеячы партыі нібы атрымалі ад прэмэра Танака 11 тысяч ен за тое, што абяцалі стрымаць дэпутатаў ад галасаваньня рэзалюцыі недавер'я ўраду, пакавецкай буржуазнай апазіцыяй. Водлуг вестак рабочых колаў, выказаном Ніхонтай-Сэйто абмяркоўваў гэтыя выкрыцьцяньні, прычым Хірано прызнаўся, што ён сустракаўся з сябрамі ўраду, у тым ліку з раннейшым вайсковым міністрам, генэралам Угакі. Раскол Ніхонтай-Сэйто лічыцца магчымым.

У ЛІТВЕ.

НОВЫ ЛІТОЎСКІ НАЧАЛЬНІК ГЕНШТАБУ.

КОЎНЯ, 30-1. Выкананьне абавязкаў начальніка генэральнага штабу пасьля адстаўкі Плехавічуса ўскладзена на пакоўніка Кабелочаса.

Арышты паляжаў.

Гэтымі днямі ў вакацыях Канабле, у раёне Друскеніс, літоўская паліцыя арыштавала 2 польскіх грамадзян: І. Семашку і В. Грыкоўскага па абвінавачэньні ў шпіёнскай дзейнасьці на карысьць Польшчы.

300 літоўскіх эсдэкаў у астрозе.

Латвійская прэса паведамляе, што, згодна з зьвяшчэньнямі на выдадзена адбыўшыяся ў Коўні зьезьдзе літоўскіх сацыял-дэмакратаў, 300 сацыял-дэмакратаў знаходзіцца цяпер у літоўскіх астрогах.

Напады шаўлісаў.

„Дзеньнік Віл." (№ 24) паведамляе, што ў нядзелю, 27 студзеня, у раёне Троп і Аран—літоўскія шаўлісы зрабілі два напады на польскія сяла. Першы напад меў месца ў фальв. Дакеле, уласнасьці п. п. Даніеўскіх. У дом увайшлі 16 шаўлісаў, узброеных у ні, пажы, і сякеры і зьбілі 9 асоб у часе адбываўшайся вечарыны. Другі выпадак здарыўся ў в. Конаслуцка, дзе шаўлісы напалі на дом мясцовага польскага дзеяча А. Шэрэмэта, зруйнавалі памяшканьне і параніі каменьнем двох сямёў.

Пераварот у Коўні?

Віленскія польскія газэты: «Дзеньнік Віл.», «Кур'ер Віл.» і «Слово» за 1 лютага г. г. падаюць сэнсацыйныя весткі аб перавароце ў Коўні. Згодна з гэтымі данымі, шэф генэральнага штабу палк. Плехавічыус, звольнены з сваёй пасады з прычыны палітычных разыходзін з Вальдэмарасам, быў потым апошнім арыштаваны. Разам з Плехавічыусам былі арыштаваны і іншыя вышэйшыя літоўскія афіцэры.

Гэта—пішуць далей газэты,—выклікала з-бурэньні ў ковенс ім гарнізоне Ёсьць чуткі,—камэнцыруюць яны,—што армія выказваецца за Плехавічыуса, а саюз шаўлісаў (стралкоў) і арганізацыя «Жалезны воўк» за Вальдэмараса. У Коўні абвешчана асаднае палажэньне, цэнзура газэт і выдана адозва, заспакойваючая людзьмасьць і войска.

З Кашадар і Шавель сьцягнуты ў Коўню тамашнія палкі. У кожную хвіліну можна спадзявацца на бойку між аддзеламі Плехавічыуса і ўрадавымі. Вальдэмарас з габінэтам міністраў замкнуўся ў будынку рады міністраў, які сьцеражэцца вернымі ўраду палкамі і шаўлісамі.

«Дз. Віл.» дадае, што ім атрымана неспраўджаная вестка, што Вальдэмар с арыштаваны.

Усе гэтыя весткі перадаюцца віленскімі польскімі газэтамі з захапленьнем і камэнцыруюцца на ўсе лады. Наколькі, аднак, яны адпавядаюць сапраўднасьці, мы, да атрыманьня пэўных вестак, ня можам сказаць і паданыя вільнскімі газэтамі весткі пакідаем на іх адказнасьці.

Савецкая мастацка самэтужная выстаўка ў Нью-Ёрку.

НЬЮ-ЁРК, 1-2. 31-га студзеня ўвечары ў Нью-Ёрку адчынілася савецкая мастацка самэтужная выстаўка, наладжаная Усес. Т-вам культурнае сувязі з заграніцаю і Амгандлем. На адчыненьні было шмат публікі. Водгукі ў друку спрыяючыя.

ПАЧЫНАЮЦЦА ЯПОНА-КІТАЙСКІЯ ПЕРАМОВЫ.

ШАНХАЙ, 31-1. Японскі пасланьнік у Кітаі Іёшізава, які вярнуўся з Нанкіну ў Шанхай, заявіў, што, на яго думку, перспэктывы японска-кітайскіх перамоў спрыяючыя. Іёшізава зазначыў, што цяперашні індыдэнт уладжан здавальняюча і што зараз намечана распачаць перамовы на мытаньнях японска-кітайскага ўгавору.

Японія прызнала новыя мыты Кітаю.

ШАНХАЙ, 1-2. Японскі консул у Нанкіне афіцыйна паведаміў нанкінскі ўрад, што Японія бярэ да ведама ноту Нанкіну з паведамленьнем аб устанаўленьні з 1-га лютага новых мытных тарыфаў.

Новыя арышты прафпрацаўнікоў на Ўсх.-Кіт. чыг.

ХАРБІН, 30-1. Арыштавана яшчэ 7 прафэсыянальных працаўнікоў, у якіх учынен вобыск у памяшканьні вучастковага к-ту ў той час, як там быў вобыск. Друку хатэгарычна забаронена паведамляць аб арыштах.

Румынія ў кабале франка-амэрыканскага капіталу.

ПАЗЫКА ПАД ЗАКЛАД ТЫТУНЁВАЕ І ЗАПАЛАЧНАЕ МАНАПОЛІІ.

ПАРЫЖ, 31-1. Учора румынскі міністр фінансаў Паповічы, які знаходзіцца ў Парыжы, падпісаў з канцэрсыюмам французкіх банкаў згоду аб наданьні Румыніі пазыкі. Водлуг вестак фінансавых колаў, разьмеры пазыкі могуць быць павялічаны да 80-ці міліёнаў даляраў пры ўмове забясьпекі пазыкі прыбыткамі ад тытуневае манаполіі, якая будзе перададзена пад кіраўніцтва спэцыяльнай „аўтаномнай касе".

ПРАВАЛ АНГЕЛЬСКАЕ ЗАЦЕІ.

Некалькі часу таму назад, калі тэлеграмы прынесьлі нам гестку аб захопе Кабулу лідэрам рэакцыянэраў Бачэ-Сакао, нашы газэты пісалі, што ня прыходзіцца лічыць перамогу рэакцыі ў Аўганістане доўгай. Далейшыя падзеі паказалі, што перамога рэакцыянэраў аказалася яшчэ больш міфічнай, чымся можна было спадзявацца спачатку. Лідэру паўстанцаў Бачэ Сакао з яго атрадамі кугістанцаў удалося пры паяўнасьці адначасовага паўстаньня ў Джалалабадзе і з прычыны вдрады некаторай часткі войска падышаха Амануллы захапіць сталіцу і абвесьціць сябе эмірам Аўганістану, але ўтрымаць у сваіх руках уладу аказалася цяжэй, чымся захапіць яе. Племя шынвары, якое пачало паўстаньне ў Джалалабадзе, ня выказала ніякага жаданьня прызнаць уладу Бачэ Сакао і зараз жа пачало супроць яго ўзброеную барацьбу, а шэраг пляменьняў і найбольш буйных правінцый Аўганістану пастанавілі падтрымаць перавахушага ў Кандагар Амануллу-хана, які зараз-жа пачаў арганізоўваць у Кандагары новую армію. І ёсьць усе падставы думаць, што праз нейкі час паўстаньне рэакцыянэраў супроць ініцыятара прагрэсыўных рэформ у Аўганістане Амануллы-хана будзе зусім зьліквідавана.

Ня спыняючыся на апісаньні стратэгічнага становішча, мы лічым патрэбным зазначыць, што той выгляд, які набылі падзеі ў Аўганістане пасьля захопу Кабулу паўстанцамі, самым неабвяржымым парадкам сьведчыць, што першапачатковы посьпех паўстаньня тлумачыцца толькі тым кіраўніцтвам, якое яны атрымалі звонку—з англійскай мяжы. Бо паўстаньне супроць Амануллы з боку правадыроў тых ці іншых пляменьняў, скарыстаўшых рэлігійны фанатызм на сельніцтва, магчыма было, зразумела, і бяз усякага націску звонку,—з гэткімі паўстаньнямі Амануллы-хану прыходзілася мець справу ўжо ня раз, - але толькі вопытная рука англійскага кіраўніка магла дабіцца адначасовага выступленьня ня мачных паміж сабой нічога агульнага пляменьняў шынвары і кугістанцаў, арганізаваўшы ў той-жа час частковае паўстаньне ў войсках Амануллы-хана.

Авантура была арганізавана ўмела, але як і ўсякая авантура, не магла даць посьпеху на доўгі час. Бо адна справа—арганізаваць адначасова тры бунты супроць Амануллы-хана пад лёзунгам абароны ісьлама, а другая справа—дабіцца пры дапамозе гэтых бунтаў адмаўленьня Аўганістану ад незалежнасьці і ад палітыкі эўрапеізацыі краіны. Цікава адзначыць, што самі англійцы прадбачылі магчымасьць правалу сваёй зацеі, і «Таймс» у артыкуле, прысьвечаным адмаўленьню Амануллы, павінен быў прызнаць, што самі па сабе сілы рэакцыі былі-б недастаткоўны, каб пізрынуць Амануллу, што яго прывяло да загібелі толькі паўстаньне ў арміі, і што муллам, «можа ўдасца бачыць канец караляраформатара, але не канец яго рэформ».

«Таймс», вразумела, сьвядома абцінуў яшчэ адну сілу, якая садзейнічала першапачатковаму паражэньню Амануллы—ангельскае кіраўніцтва паўстаньнем. Але факт застаецца фактам: унутраных прычын для канчатковай перамогі рэакцыі ў Аўганістане ня было. Бо з ангельскага пункту гледжаньня гэткай перамогай было-б ператварэньне Аўганістану ў так званую закрытую дзяржаву—з высяленьнем з Аўганістану ўсіх місій, апроч ангельскай,—а на гэта ніколі не згадзіліся-б ні аўганскія пляменьні, якія вялі з Англіяй адвечную барацьбу за незалежнасьць, ні кабульскія, герацкія і кандагарскія купцы, якія вялі ўжо досыць значны замежны гандаль.

Працоўныя Савецкага Саюзу, сымпатыі якіх нязьменна накіраваны у бок усіх, хто змагаецца за незалежнасьць ад эўрапейскіх імпэрыялістаў народаў Усходу, са задаваленьнем спатыкаюць новы паварот падзей у Аўганістане, у выніку якога працоўныя гэтай краіны пазбавяцца ад пагражаючага ім ангельскага ярма і дамогуцца вызваленьня краіны ад путаў сярэднявяковага феадалізму.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Помсты за пікуты відзеўскіх тэкстыльшчыкаў.

ЗАБОЙСТВА ДЫРЭКТАРА ВІДЗЕЎСКАЕ МАНУФАКТУРЫ. ЗАБОЙЦА—ВІДЗЕЎСКІ РАБОЧЫ—ТАКСАМА ПАМЁР АД РАН.

ВАРШАВА, 1-I. У Лодзі стрэлам з рэвалвэру на сьмерць паранен галоўны дырэктар і адзін з уласьнікаў Відзеўскае мануфактуры Альбэрт Кон. Забойца —звольнены рабочы Відзеўскае мануфактуры Цасінскі. Адстрэльваючыся, Кон параніў Цасінскага, які памёр у паліцыі. Кон памёр праз некалькі гадзін пасьля аперацыі.

Забойства Кона зрабіла ў Лодзі вялікае ўражаньне. Відзеўская мануфактура — адзіная, якая пасьля сканчэньня забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Лодзі, не згадзілася ажыцьцёвіць арбітражную пастанову і даць рабочым 5-ці процантную прыбаўку. У выніку гэтага рабочыя Відзеўскае мануфактуры абвясьцілі новую забастоўку, якая цягнулася 2 месяцы. Забастоўка скончылася паражэньнем рабочых; адміністрацыя, не зважаючы на абяцаньні, звольніла з працы шмат удзельнікаў забастоўкі.

ДЫСКУСІЯ НАД БЮДЖЭТАМ У СОЙМЕ.

У польскім сойме пачалася генэральная дыскусія над бюджэтам. Перад тым, як абгаварваць бюджэты паасобных міністэрстваў, соймавыя партыі выступаюць з сваімі дэкляратыўнымі заявамі агульна-палітычнага зьместу. Між іншым, пэпэсавец Жулаўскі так ахарактарызаваў сучаснае палітычнае становішча ў Польшчы: «Агульнае бязладзьдзе, адсутнасьць адказнасьці, поўнае нялічэньне з грамадзянствам, пэрсанальныя ўплывы, непашанаваньне і ігнараваньне законадаўчых палат, абніжэньне аўтарытэту судоў, міністры ня кіруюць сваімі міністэрствамі, а пэўныя групы, якіх міністры павінны слухаць. Народ наш,—закончыў прамоўца,—цьвёрды; вытрымаў ужо не раз акупацыю чужых заборцаў, вытрымае акупацыю ўласных заборцаў.

*Ад „блёку супрацоўніцтва з урадам" выступіў пасол Санойца, былы вызваленец, які сказаў даўжэнную і нудную прамову, зьмест якой «Дз. Віл.» (№ 26) характарызуе так:

ПРЫВІТАНЬНЕ

Аб'яднанай Беларускай Вайсковай школе ад ЦК КП(б)Б.

У дзень 8-мігодзьдзя слаўнага існаваньня чырвонай кузьні байцоў за справу Кастрычніка—АБВШ імя ЦВК БССР, ЦК КП(б)Б шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне партыйнаму калектыву, курсантам і начскладу школы.

Чырвоная армія, створаная камуністычнай партыяй—партыяй Леніна з чэсьцю выконвала абавязкі ўскладзеныя на яе вялікім Кастрычнікам, яна выкавала з масы рабочых і сялян сваіх пралетарскіх камандзіраў.

І зараз, калі савецкая краіна занята сацыялістычным будаўніцтвам, калі сусьветны капіталізм рыхтуе новы ўзброены паход супроць адзінай пралетарскай рэспублікі перад Чырвонай арміяй стаіць задача—сталёвай сьцяной стаяць на варце межаў БССР і СССР, паглыбляць вайсковыя і ленінска-палітычныя веды. А перад вайсковай школай стаіць задача выхаваньня стойкіх чырвоных камандзіраў, адданых пралетарскай справе, адданых бальшавіцкай партыі, узброеных як рэвалюцыйнай ленінскай тэорыяй, так і тэорыяй тактыкі і стратэгіі клясавай вайны.

ЦК КП(б)Б упэўнен, што ў надыходзячых клясавых бойках за сусьветную перамогу пралетарскай рэвалюцыі, Чырвоная армія на чале з яе начскладам пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі заніша новую слаўную старонку ў гісторыю клясавай барацьбы за камунізм.

Няхай жыве камуністычная партыя бальшавікоў!

Няхай жыве Чырвоная армія і яе камандзіры!

Няхай жыве Аб'яднаная Беларуская Вайсковая школа імя ЦВК БССР!

ЦК КП(б)Б.

Зачыненьне першага ўсебеларускага агранамічнага зьезду.

Прамова тав. Прышчэпава.

Перад зачыненьнем зьезду, якое адбылося 1-га лютага, выступіў Народны Камісар Земляробства тав. Прышчэпаў з наступнай прамовай.

— Праца гэтага зьезду—адзначыў т. Прышчэпаў,—набывае каласальнае значэньне. Дзякуючы яму ўдалося з'арганізаваць спэцыялістаў сельскай гаспадаркі ў адзіную магутную рэспубліканскую арганізацыю. Падругое, на гэтым зьезьдзе была магчымасьць абмяняцца вопытамі ў навуковых і практычных галінах вывучэньня с.-г., і на падставе гэтых вопытаў ёсьць магчымасьць арганізаваць на ўсебеларускім маштабе адзіныя задачы па шырокай сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г., якія ставіць Камуністычная партыя і Савецкі Урад перад аграманміяй.

Важна тое, што мы заслухалі і прадэманстравалі тут цэлы шэраг новых ідэй і думак. На гэтым зьезьдзе была вылулена вялізарная актыўнасьць як навуковых супрацоўнікаў і прафэсураў, так і ўсіх тых аграномаў, якія прыходзяцца працаваць на вёсцы. Мы пачулі тут цэлы фэйэрверк новых кашэтоўных думак, і важна тое, што нам удалося згрупаваць гэты багаты матар'ял, які будзе пакладзен у аснову рэканструкцыі сацыялістычнага будаўніцтва і ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Праца гэтага зьезду выяўляецца тым больш каштоўнай, што ўсе выступалі ва ім адназгодна, што сьведчыць аб тым, што мы справіліся практычна з усімі задачамі; гэта зьяўляецца палітычнай, тэхнічнай і навуковай рэвалюцыяй, праз якую мы, бязумоўна, павернем сельскую гаспадарку на той сацыялістычны шлях, які мы вызначылі. Вось гэта і зьяўляецца характэрнай рысай нашага зьезду.

На гэтым зьезьдзе аграном мог убачыць, як у БССР разгарнулася вялізарная дасьледчая праца. У гэтай дасьледчай справе дэманстравалася само жыцьцё. Гэта казаць вам яшчэ больш энэргіі, больш энтузіязму і рэвалюцыйнага размаху, бо вы праводзіце вялікую навукова-дасьледчую справу.

Пачынаючы з данага зьезду, мы находзім форму гэтае працы. Тым больш карыснай будзе гэта праца, што яна будзе абапірацца на тысячы аграномаў, на тысячы сялян-дасьледчыкаў. Трэба дабіцца самай шчыльнай сувязі аграномаў з дасьледчымі установамі. Ваша праца на мясцох павінна быць адным з асноўных матар'ялаў для нашых дасьледчых установ.

Важна тое, што мы распрацавалі цэлы шэраг мерапрыёмстваў адносна формаў і мэтадаў агранамічнай працы. Мы распрацавалі толькі формы. Калі мы разгорнем с.-г. друк, то зможам адшукаць рэвалюцыйны зьмест у нашым с.-г. будаўніцтве.

Нашы агранамічныя арганізацыі павінны разумець, што аграномы ў першую чаргу павінны быць арганізатарамі сацыялістычнага будаўніцтва. У нашых умовах аграном тады будзе добрым кіраўніком, калі ён ня будзе толькі вузкім спэцыялістам, якім аграном зьяўляецца на Захадзе. Ён павінен быць аграномам з пралетарскай ідэолёгіяй. Толькі пры гэтых умовах ён зможа выкарыстаць тэхніку ў напрамку сацыялістычнага будаўніцтва.

— Вы маеце справу, кажа прамоўца,—з індывідуальным сэктарам. Вы павінны разумець усе цяжкасьці, вы павінны разумець, што гэтыя расьцярушаныя гаспадаркі трэба ўцягнуць у сацыялістычнае будаўніцтва. Трэба мець досыць энэргіі, досыць рэвалюцыйнай актыўнасьці, каб можна было праводзіць гэтыя рэфармацкія задачы.

Ва ўмовах Беларусі, дзе ёсьць досыць навуковых працаўнікоў, дзе ёсьць дасьледчыя ўстановы, дзе ёсьць шырокая агранамічная сетка, дзе існуе с.-г. Акадэмія, мы можам практычна справіцца з вялікай задачай па сацыялістычнаму будаўніцтву, з рэвалюцыйнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі.

— За новую зямлю!

— Няхай жыве новае сацыялістычнае земляробства!

Рэзалюцыя

ПЛЕНУМУ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПРЫ ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ ПА ДАКЛАДУ МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ І САДАКЛАДУ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ МЕНСКАГА ГОРСАВЕТУ 24 СТУДЗЕНЯ 1929 Г.

Заслухаўшы даклад тав. Каранеўскага і содклад т. Эйдэльмана аб ходзе справаздачна перавыбарчай кампаніі па Менскай акрузе і г. Менску, Цэнтральная Выбарчая Камісія адзначае, што на ланы вэрынд часу кіраўнічая работа акруговай і гарадзкой выбарчых камісій разгорнута даволі шырока і праводзілася нармальна, чаго не назіралася ў пачатку справаздачнай кампаніі. У выніку гэтага мацнела здавальняючая актыўнасьць і яўка выбаршчыкаў як на справаздачных, так і на перавыбарчых сходах: 41,9 проц. усіх выбаршчыкаў і 19.8 проц. выбаршчыц жаночых прысутнічала на справаздачах сельсаветаў, замест 39 проц. выбаршчыкаў і 12-14 проц. жанчын у мінулую кампанію; на выбары ў саветы, дзе ўжо адбыліся перавыбары, зявілася ў сярэднім 62,1 проц. усіх выбаршчыкаў і 43,6 проц. выбаршчых-жанчын замест 45 проц. выбаршчыкаў і 25,1 проц. выбаршчых-жанчын у папярэднія перавыбары; павялічыўся процант выбраных у саветы жанчын у параўнаньні з папярэднімі перавыбарамі з 6,4 да 21,2 проц.

З адмоўных зьявішчаў у часе праходжаньня справазда-перавыбарчай работы мелі месца: а) выпадкі слабай работы па згуртаваньню сераднякоў масы вёскі з беднатою; б) у некаторых мясцох недахватнае прадстаўніцтва кандыдатур ад сераднятства ў выбраных саветах; в) выпадкі недастатковай арганізацыі барацьбы супроць кулацка-нэпманскіх элемэнтаў; г) пабудаваньне ў частцы райвыканкомаў, сельсаветаў і г. д.).

ж) У час, які застаўся да скавчэньня перавыбараў па мясцох і ў горадзе, узмацніць работу на конкурсу, максымальна скарыстаўшы ўсе матар'ялы справаздачных сэкцый, дэпутатаў і г. д.

з) Маючы на ўвазе адзначаныя на папаседніх сходах сяродкі кулацкіх і іншых варожых элемэнтаў скарыстаць у сваіх мэтах лёзунг нацыянальнага адзінства, даручыць акруговай выбарчай камісіі выкарыстаць і паглыбіць клясавую барацьбу сярод пашыменшасьцяў, забясьпечыўшы актыўную ролю бедноты ў саюзе яе з сераднякам для рашучага адпору варожым імкненьням на падставе яскравай клясавай лініі.

Прымаючы пад увагу усё яшчэ слабае ўцягненьне батрацтва ў перавыбарчую кампанію, даручыць менскай акруговай выбарчай камісіі зрабіць усе захады да павялічэньня актыўнасьці і ролі батрацтва ў перавыбарах, а таксама да больш шырокага прыцягненьня прадстаўнікоў батрацтва ў склад саветаў.

Старшыня Цэнтральнай Выбарчай Камісіі пры прэзыдыуме ЦВК БССР А. Хацкевіч.

Сэкратар А. Барман.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вясеньняя пасяўная кампанія пад пагрозаю зрыву.

Самахвалавічы, 2-2. На тым меркаваньням і гутаркам, а таксама і абгаварваньні гэтага пытаньня ў адпаведных установах, можна было чакаць, што вясеньняя пасяўная кампанія павінна прайсьці з посьпехам. Але звычайна рэч у жыцьці, што пляны з жыцьцём не ўвязваюцца.

Зерноачышчэньне праходзіць сусім слаба. Машыны стаяць без нагрузкі. Толькі з 6 студзеня агрупунктам выпушчан абоз на райён, а як апошні працуе, то ніхто ня ведае, бо рэйагранам п. аводзіць перавыбары, загадчык райзэмчасткай таксама. Адзін аграном на курсах, другі ў адпачынку.

На мясцох сярод сялянства не вядзецца ніякім ніякай працы ў гэтым напрамку. Між іншым па пратаколам з месц можна заўважыць, што сялянства Трасьцянецкага, Цепленскага і Кайкаўскага с-с. падымалі пытаньне на сходах аб тым, каб далі ім машын для ачысткі насеньня.

Здаецца, што гэтых пратаколаў не прагляналі і чакаюць у моры пагоды. Па складзенаму пляну прадбачылася ачысьціць насеньня на маючыхся машынах у раёне 330 тон, дагэтульжа ачышчана толькі 12 тон. Бязумоўна, што на гэта пытаньне трэба зьвярнуць большую ўвагу. Адпаведным органам неабходна даць на месцы тэрміновыя ўказаньні ў гэтым напрамку.

Усім грамадзкім арганізацыям і ўстановам, а таксама і актыву вёскі трэба зьвярнуць максымум увагі на падрыхтоўку к вясеньняй пасяўной кампаніі ў зьвязку з дёзунгам «праблемы падвышэньня ўраджайнасьці».

Бор.

З восені—рыхтуемся да вясны.

За пераход на шматпольле (8-мі польле) і культурнае вядзеньне гаспадаркі пасёлак «Перадавы» у 1926 годзе атрымаў ад земельных органаў акругі сартыроўку „Трыумф" і канюшынасеянку. Цяпер сяляне кожды год пры малацьбе сартуюць ня толькі збожжа для пасеву, але і тое, што ідзе на ўжытак сем'яў, што дае магчымасьць кожны год 10 пудоў у сярэднім на гаспадарку эканоміі зярна для корму жывёлы, якое будучы пасеяна неачышчаным загіне ў зямле. Некаторыя сяляне зьбіраюць попел для ўгнаеньня. Чысьцяць на сартыроўцы пас. «Перадавога» і іншыя сяляне, але-ж ня кожнае збожжа на ёй можна ачысьціць, як, напрыклад, лён, а насенна-ачышчальнага абозу з агрупункта ячэня было ў Рыскове. Сяляне рыхтуюцца да вясны закантрактаваць плошчу пад пасеў лёну і бульбы.

Лужанін.

Загатоўкі насеньня павялічыліся.

Гомель, 2-2. Загатоўка насеньня для вясеньняе засеўна: кампаніі праходзіць пасьпяхова. Плян загатовак выканан у разьмерах 62 проц. Плян выканан па асобных культурах на 80 проц. Загатоўленае насеньне адпавядае патрабаваньням насеннае кандыцыі.

У акрузе таксама ўзмацніўся попыт на сельска-гаспадарчыя машыны. Асаблівы попыт на трыеры. Нажаль, попыт на трыеры ня будзе цалком задаволен. Плугамі і веламі забясьпечаны для задаволеньня попыту.

10.000 гэктараў пустуючых зямель пад выганамі.

Слуцак, 2-II. Амаль 10 проц. складаюць выганы з агульнай зямельнай плошчы райёну.

Усё часьцей прыходзіцца чуць ад малазямельнага сялянства запытаньні: якую карысьць нам прыносяць выганы. Задзічалі яны. Абрасалі мохам, купінамі. Жывёла харчу ад выгана ніякага ня мае, акраяя паветра.

У шэрагу вёсак, як у Ласунох, Бас лаўцах, Малым Быкаве, Ялічах і іншых, гэтыя выганы пават разьмяркованы на полясы на кожны двор, але карыстацца імі асобныя гаспадаркі ня могуць, бо ў вёсцы ня ўсе гэтага хочуць.

Напрыклад: заможнаму трэба мець пад бокам пашу—зямлі ў яго хапае, а калі будзе зямляўпарадкаваньне яшчэ абражуць. Іншая справа малазямельнику. Яму трэба зямлі, або кусочак сенажаці. Ён бы з вялікае ахвотаю апрацаваў, палепшыў задзічалы выган. Так і чакае маламоцнік каморніка. Але сама справа не чакае, бо і кароўка зімою харчу не мае, і пахаці пад хлебныя культуры ў бедняка кавалачак на галодную норму. А з погляду задачаўядыму сельскае гаспадаркі і ўраджайнасьці, каб вырваць выгоны з кіпцюроў кулака—магчыма было-б надзяліць ма.

Дашко.

Арганізаваны агнятрывалыя таварыствы.

Гомель, 2-1. Лік агнятрывалых таварыстваў у акрузе павялічваецца. У сучасны момант ужо арганізавана 70 таварыстваў.

Сёлета г-тымі таварыствамі будзе выпушчана да 10 мільёнаў штук пэгы.

У акрузе таксама ўзмацніўся попыт на сельска-гаспадарчыя машыны. Асаблівы попыт на трыеры. Нажаль, попыт на трыеры ня будзе цалком задаволен. Плугамі і веламі забясьпечаны для задаволеньня попыту.

Перавыбары скончаны.

ГОМЕЛЬ, 2-1. Перавыбары саветаў у акрузе скончаны. Распачата падагуленьне вынікаў перавыбарчай кампаніі і падрыхтоўка да правядзеньня райённых зьездаў саветаў.

ЦРК да агляду чырвонай казармы.

Гомель, 2-1. *У сувязі з аглядам чырвонай казармы ЦРК пачаў абсьледваньне каапэрацыйных лавак у воінскіх часьцях. Асобныя лаўкі будуць пераабсталяваны для лепшага абслугоўваньня чырвонаармейцаў.*

Закуплены каапэрацыйныя бібліятэчкі для воінскіх часьцей. Праводзяцца вечары пытаньняў і адказаў на каапэрацыйныя тэмы.

Чырвоны Крыж пачаў праводзіць лекцыі па санітарных пытаньнях, набывае некаторыя рэчы для патрэб воінскіх часьцей.

Пад лёзунгам калектывізацыі.

У Вільчецынскім выбарчым райёне, Станькоўскага с.-с., Койданаўскага р., перавыбары прайшлі пад лёзунгам каапэраваньня і калектывізацыі насельніцтва. У наказах ухвалена арганізаваць каапэратыў, 4 калгас, групавыя сады заклясьці з наступнага году, перайсьці на шматпольле з правільным севазваротам, неабходныя агранамічныя мерапрыёмствы праводзіць у абавязковым парадку, як увядзеньне сартавога семяннога матар'ялу, ачыстка яго, барацьба са шкоднікамі і г. д.

У сельсавет выбраны кандыдаты сходам беднаты на 100 проц. Партыйны склад 50 процантаў, жаночы 50 процантаў.

А. З.

Скарысталі балота.

Шмат гадоў жылі тут людзі і ніякай карысьці ня мелі з гэтага аржавіньня. Казалі саханяты в. Коршыкава, Ляднянскага р., як пераходзілі на новае жыцьцё і такі запраўды ніхто ніякай карысьці ня меў з «Каменкі», —так звалі гэта балота,—што ўзялі саханяты.

Аднойчы заехаў да саханят аграном, які параіў асушыць аржавіньне. Сяляне згадзіліся і прыняліся за працу. Шмат працы паклалі саханяты на гэту справу, а суседзі заўсёды сьмяяліся.

Гады праз паўтара пасьля асушкі пашлі саханяты касіць «Каменку». Накасілі вазоў па сем кожны і суседзяў стала браць зайздросьць.

Р.

Аршанчына.

Аўтамабільна-трактарныя курсы.

Гомель, 2-I. Пачалі працаваць першыя акруговыя курсы па вывучэньню аўтамабільна-трактарнай справы. На ўрачыстым адчыненьні курсаў з прывітальным словам выступіў старшыня акрвыканкому т. Амбражунас.

Члены аўтадору выяўляюць вялікую цікавасьць да курсаў. На курсах навучаецца 85 чал.

ПРАФЭСАР Х. АФАНАСЬЕЎ:

БЕЛАРУСЬ МАЕ ЎСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ВЫСОКАГА ЎРАДЖАЮ

Для ўсіх часоў і народаў зьяўляецца бясспрэчным, што ўраджайнасьць у цэлым комплексе прычын навуковых залежыць ад фактару—глебы, ад яе натуральных і набытых пры культуры вытворчых сіл.

У краінах з багатымі глебамі (як украінскія чарназёмы) ураджай перш усяго залежаць «ад міласьці неба» і цэнтрам увагітам зьяўляецца клопат аб вільгаці. Беларусь амаль ня ведае згубнае сушы, тут—зона «вільготнага земляробства», і часьцей прыходзіцца думаць аб выдаленьні лішкаў вільгаці. Беларускія земляробы павінны больш глядзець не на неба, а ў зямлю, як яе палепшыць. Бо тая натуральная ўраджайнасьць, якая ёсьць у чарназёмных краінах, як дарэмны дар прыроды, у нашых глебах неабходна ўтварыць цэлай сыстэмай мерапрыёмстваў каранной меліярацыі, без чаго нашы глебы кепска родзяць ці зусім ня родзяць.

Гэтыя глебавыя і прыродныя фактары ляжаць у аснове радыкальных адзнак сыстэм земляробства на Беларусі і па Украіне.

Якавы глебы Беларусі і ў чым яны перш усяго адчуваюць патрэбу для высокіх ураджаў?

Два асноўных глебавых тыпы складаюць тэрыторыю Беларусі: глебы падзолістыя (пяскі і суглінкі) і глебы падзоліста-балоцістыя (пясчаныя). У сілу векавых працэсаў падзолана-сланьні ў пераважнае большасьці глеб Беларусі, г. зв. «спажываючы комплекс» іх (гэты галоўны вартаўнік і рэгулятар актыўных спажываючых рэчаў) вельмі зруйнаваны, малы па вялічыні і не насычаны асновамі. Адгэтуль мы маем цэлы шэраг вынікаў: глебы кіслыя, вышчалачаныя, бедныя гумусам, бесструктурныя і слабыя па запасу спажыўных рэчаў. Таму гэтыя глебы адчуваюць патрэбу рашуча ва ўсіх выглядах угнаеньняў і да таго-ж камбінаваных.

Аднак, апрача мінэральных тукаў, нашы глебы нязьменна адчуваюць патрэбу ў натуральным угнаеньні; нават пры высокіх і камбінаваных дозах мінэральных угнаеньняў для нашых глеб патрэбна значнае і папярэдняе ўгнаеньне гноем, асабліва на пясках, супесях, бо мінэральныя спажыўныя тукі ўплываюць на хімічны бок, не паляпшаюць, ці слаба паляпшаюць фізыку біёхіміку глеб (органа-мінэральныя калёіды, структура, аэрацыя, бэхтэрыяльныя працэсы і г. д.). Гэтую ролю дасканала выконвае гной.

Як асаблівую і прытым як кантралюючую меру вельмі важна правесьці абвапнаваньне глеб. Вядомы «правал» часоў Мэндэлеева вопыту з мінэральнымі тукамі на падзолістых глебах у значнай меры трэба адносьці на гэты кошт. Толькі абвапнаваньне разам з угнаеньнем зьяўляецца сапраўдным і назэйным сродкам уплыву на цэнтральную і інтымную частку гл б—на спажываючы комплекс. Абвапнаваньне ў Заходняй Эўропе зьяўляецца такой усеагульнай і агульнавядомай мерай, якая праводзіцца папярэдня і побач з іншымі выглядамі ўгнаеньняў.

Акуль узяць у Беларусі вапну і чым замяніць недахоп гною?

У прыродных умовах Беларусі ў наяўнасьці цікавыя зьявішчы з галіны камплексуючых фактаў. Так працэс вышчалачаньня вапны з глеб і парод накапляюць яе тут блізка, у суседніх лагчынах рэчак і балот у выглядзе залежаў прэснаводных мэргеляў. (Уся сыстэма р. Проні, тарфянікі оа лот Палесься і г. д.)

Апрача таго, крыніцаю вапнавых угнаеньняў могуць зьявіцца выхады мэргеляў і крэйды у б. Калінінскай акрузе, у Случчыне, а таксама вялізныя накапленьні валуноў дэвінскага вапняка, якія ў сучасны момант, а нават раней служаць прадметам саматужных заводаў для апальваньня вапны (у Ворпы і іншых мясцох).

Дзеля гэтага ж можна карыстаць карбанотныя пяскі і марэны, якія даволі распаўсюджаны.

Вельмі бедныя гумусам нашы падзолістыя глебы побач з сабою маюць амаль невычарпальныя запасы арганічных матэрый у тарфяніках. Сама прырода нібы паклапацілася і падказвае выкарыстаць гэтыя вялізныя запасы арганічных матэрый на адпаўленьне гумусавае і попельнае ўраджайнасьці беларускіх глебаў.

Сюды ж трэба аднесьці багацейшы іл нашых саджалак, балот, нізін, поймаў і г. д., які як вядома, грае аграмадную ролю ў сельска-гаспадарчай Фінляндыі.

На пясках і супесях, якіх у Беларусі каля 50 проц. усёй тэрыторыі рэспублікі, гной в посьпехам і даўно замяняюць лубінам. Распаўсюджваньне шырока «ў абавязковым парадку» лубіну павінна зьявіцца першачарговай задачай пясчаных вопытных станцый.

Глебы падзоліста-балоцістыя, у першую чаргу адчуваюць патрэбу ў мерах апэрацыі, якіх ёсьць два выгляды: дранаж і дагляд за пахатным пластом.

Нашы лугавыя глебы і часткаю пахатныя землі пасьля дранажу, аднак, адначасова адчуваюць патрэбу ў арэуваньні дзярнины, бо ў адваротным выпадку, бываюць нізкія ўраджаі. Да гэтага дадамо наступнае: нашы нагляданьні над падобнымі глебамі выкрылі прысутнасьць у іх пласьце 3-15 сант. закіслага жалеза, нярэдка ў працэнту усяго вэгетацыйнага перыяду. Гэтае зьявішча шырока распаўсюджана ў Беларусі.

Неабходна рашуча зьнішчыць купі на сенажацях—яна крыніца доўгае мерзлясьці з усімі шкоднымі вынікамі.

Дасягнутыя высокія ўраджаі на вольгных станцыях Беларусі (палявых і балотных) з відавочнасьцю сьведчаць што нашы глебы пры адпаведных мерапрыёмствах могуць набываць высокую вытворчасьць і даваць ураджаі, якія набліжаюцца да чарназемнае зоны.

Неабходна і можна гэтыя дасягненьні культурных базісаў Беларусі зрабіць уласнасьцю ўсіх земляробаў нашае краіны. Праўда, для гэтага патрэбны будуць пэўныя і эканамічныя прадпасылкі, але многія з сродкаў уплыву параўнаўча простыя і даступныя і больш залежаць ад нашае ініцыятывы, культурнасьці і ад абавязковых масавых мерапрыемстваў.

Энэргічны заклік і сыстэма мерапрыёмстваў нашага ўраду зьяўляюцца мерай неадкладнай.

Зьмешчаная ў № 25 (2514) нашай газэты (за 2 лютага г.) павестка дня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў—папярэдняя, неафіцыйная і надрукавана памылкова.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Аб дзейнасьці сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту.

На гэтым пасяджэньні быў выслуханы даклад Старшыні Праўленьня Беларускага Сельска-Гаспадарчага Банку тав. Дубіна аб дзейнасьці сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту і Белсельбанку за 1927-28 г.

Дакладчык адзначыў, што за апошні год у працы сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту ёсьць значныя дасягненьні. Нізавая сетка крэдытных т-ваў пашыралася з 203 на 1-X-27 г. да 293 на 1-X-28 г. або на 90 таварыстваў. Балансы ўсіх звеньняў сыстэмы за год узрасьлі на 27.024 тыс. р. або на 52,4 проц. Сума паёў узрасла з 1.058 тыс. р. да 1.613 тыс. руб. або з 4,3 руб. на аднаго чалавека на 1-X-27 г. да 5,3 руб. на 1-X-28 г. Сума ўкладаў павялічылася за год з 609 тыс. руб. да 1.464 тыс. руб. або 855 тыс. руб. З гэтай сумы сялянскіх сродкаў уняцгута 823.500 р. Сялянскія ўклады ўзрасьлі в 212 тыс. руб. да 327 тыс. руб. або 54,3 проц. Тэмп росту ўсіх укладаў за год складае 140 проц.

За 1927-28 г. у БССР за кошт фонду каапэраваньня беднаты каапэраваньня сельска-гаспадарчымі крэдытнымі т-вамі 34.390 беднякоў, а ўсяго каапэравана ў т-вах за ўвесь час 44.090 беднякоў. Увесь фонд на крэдытаваньне беднаты складаў на 1-X-28 г.—1.500 тр. На 1-X-28 г. з фонду было выдадзена крэдытаў 16 тыс. беднякіх гаспадарак. Крэдытны плян за 1927-28 г. выканан пры нармальным, дастатковым і своечасовым паступленьні сродкаў, што дало магчымасьці своечасова фінансаваць важнейшыя мерапрыёмствы на палепшаньні сялянскіх гаспадарак. За 3 кварталы 1927-28 г. было выдадзена крэдытаў на суму 18.300 тыс. руб., з іх 49 проц.—пасобным гаспадаркам і 51 проц.—сацыялістычнаму сэктару (саўгасам, калгасам і інш. каапэрацыйным аб'яднаньням). У вясеньнюю пасеўную кампанію 1927-28 г. выдадзеныя пазыкі разьмяркоўваюцца так: 62,1 проц. беднякам, 36 проц. сераднякам і 1,9 проц. заможным, пры гэтым заможныя атрымоўвалі пазычкі ў большасьці па кантрактацыі. Наогул трэба адзначыць, што ў гэтым годзе с.-г. таварыствамі быў зроблен значны пераход у сэнсе пераважнага накіраваньня крэдытаў беднаце. Бедняцкія гаспадаркі займаюць пераважнае месца ў крэдытах на рабочую жывёлу і на насеньне, сераднятцкія гаспадаркі—на с.-г. машыны, штучнае ўгнаеньне, травасеяньне, кантрактацыю і інш., заможныя бяруць крэдыт найбольш па кантрактацыі, на с.-г. машыны і травасеяньне.

Ёсьць у працы сыстэмы с.-г. крэдыту і шэраг недахопаў, як напрыклад: перагружанасьць нізавой сеткі загатоўкамі, слабая кваліфікацыя складу праўленьняў т-ваў, значныя пратэрміноўкі пазычак і інш.

Для распрацоўкі праекту рэвалюцыі на даклад складзена камісія.

Аб пляне працы ЦСУ.

СНК заацьвердзіў плян працы ЦСУ на 1928-29 г. Асноўныя задачы плану работ дзяржаўнай статыстыкі на 1928-29 г., вызначаныя з галоўнымі праблемамі народна-гаспадарчага плянаваньня, зводзяцца да наступнага: капітальнае будаўніцтва, працэсы апрамаджаньня ў народнай гаспадарцы, высьвятленьне становішча рабочай клясы, высьвятленьне сацыяльна-эканамічных адносін у вёсцы і г. д. У канцы бюджэтнага году будзе праведзен пераліс сялянскіх гаспадарак з мэтаю вывучэньня сацыяльна-клясавага складу вёскі. У плян работ увайшла складаньне земельнага балянсу, асобна частка работ на вывучэньню вынікаў аграрнай рэвалюцыі. У 1928-29 г. будзе праведзен пераліс дробнай і саматужна-рамесніцкай прамысловасьці БССР. У першы раз БССР закладваюцца пастаянныя (галавы бюджэтныя запісы ў сем'ях рабочых (50 запісаў). Будзе праведзена чарговае бягучае абсьледваньне ўстаноў народнай асьветы. З мэтаю вырашэньня ў поўным аб'ёме якія стаяць перад дзяржаўнай статыстыкай БССР у 1928-29 г., СНК прызнаў неабходным разгарнуць працу на вывучэньню працэсаў агрэмаджаньня ў сельскай гаспадарцы, разгарнуць аналітычныя работы і ў першую чаргу ў галіне статыстыкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, павялічыць лік грашовых запісаў, якія сьвятматычна вядуцца ў сялянскіх гаспадарках з 300 да 600, вывучыць пытаньне аб рэгулячным цягаценьні насельных пунктаў БССР з мэтаю паглыбленьня распрацоўкі пытаньняў райёнаваньня.

Для падвышэньня кваліфікацыі статыстычных працаўнікоў, СНК прызнаў неабходным вывучыць патрэбныя сродкі для утрыманьня 50 слухачоў на курсах завочнай статыстычнай адукацыі пры ЦСУ БССР.

Аб завозе прамысловых тавараў.

СНК заслухаў даклад Народнага Камісара Гандлю тав. Аксючца аб пляне завозу асноўных дэфіцытных прамысловых тавараў у БССР. На другі квартал 1928-29 г. плян завозу гэтых тавараў намечан на суму 11.383 тыс. руб., з іх для гарадзкога рынку на 4.307 тыс. руб., а для сельскага рынку на 7.077 тыс. руб., пры гэтым СНК пастанавіў паставіць перад Саветам Працы і Абароны і НК Гандлю СССР пытаньне аб павялічэньні памеру намечанага плану завозу гэтых тавараў у БССР. НК Гандлю, Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу заапрацавана асноўныя прамтавары, якія пры значаны для сельскіх мясцовасьцей, якія карыстаць галоўным чынам, для задаваленьня асноўных загатоўчых райёнаў. Белкаапсаюзу даручана прыняць меры да дальнейшага ўзмацненьня прасоўваньня гэтых тавараў копраткі і абутку, а таксама ўзмацніць прасоўваньне іншай прадукцыі мясцовай прамысловасьці, бо да гэтага часу збываемай прадукцыі быў ахоплен спажывецкі каапэрацый невыстарчальна. ВСНГ запрапанавана забясьпечыць поўнае прыстасаваньне асартыменту гатовай копраткі і абутку да прад'яўляемага сялянскага попыту і павялічыць выраб прадукцыі сялянскага спажываньня. СНК прызнаў даведама заяву НКГандлю аб тым, што 76 проц. усяго завозу швейных машын выдзелена для сельскіх мясцовасьцей, пераважна для ільнаводных раёнаў. Белкаапсаюзу запрапанавана тэрмінова накіраваць у сельскія мясцовасьці максымальную колькасьць тавараў, якія да гэтага часу збываліся толькі па гарадзкім рынку, як напрыклад: мэбля, ложкі, гадзіньнікі і інш. Акрвыканкомам і райвыканкомам даручана прыцягнуць вінаватых да адказнасьці ў выпадках выяўленьня перабояў у задавальненьні райёнаў таварамі.

Дапамога беднаце ў школах г. Менску.

Пытаньне аб дапамозе бяднейшым вучням, аб фактычнай дачы магчымасьці ім ня толькі наведваць школу, але і з посьпехам яе скончыць, заняло асаблівую увагу настаўніцтва яшчэ з мінулага году. Галоўныя мерапрыёмствы былі праведзены па арганізацыі матар'яльнай дапамогі. Матар'яльная дапамога была зроблена попраткай 447 вучням, абуткам—264 вучн. і харчаваньнем—162 вучн. На гэту дапамогу патрачана ўсяго 3829 руб., з якіх 1000 руб. было выдадзена Менскім гарсаветам, а рэшта (каля трох тысяч руб.) была сабрана самімі школамі.

Калі прааналізаваць процант адсеву вучняў (процант кінуўшых школу да канца вучэбнага году), дык трэба адзначыць, што дапамога бяднейшым вучням у мінулым вучэбным годзе была недастатковая. Сярэдні процант адсеву—8,5. Процант адсеву па групе беднаты—13, а сялян—14.

Дапамога беднаце праводзілася і па другой лініі—па лініі асаблівых заняткаў з непасьпяваючымі. Для гэтага з непасьпяваючых утвараліся групы, з якімі праводзіліся заняткі настаўнікам і пасьпяваючымі вучнямі. Аб выніках сьведчыць процант другагодніцтва. У сярэднім ён не перавышае даваеннага—11,7, па групе рабочых—10,6, служачых—10,7 і саматужнікаў—11,2, але па групе беднаты ён—15. Бозумоўна, па некаторых школах ён надзвычайна нізкі, але па некаторых надзвычайна высокі, напрыклад, у школе Зах. чыгункі з беднаты на другі год пакінута 60 проц., у школе пры польтэхнікуме—45 проц., у 6 школах—100 проц., у 24 школ—28 проц., у 17 школ—22 проц. і ў 13 школ.—22 проц.

У бягучым навучальным годзе трэба зьвярнуць большую ўвагу на дапамогу беднаце ў школах, як матар'яльную, так і педагагічную.

Гарадзкім саветам вызначана па каштарысу і ўжо разьмяркована па школах 5000 рублёў. Цэнтральны Дзіцячы Дыспансэр мяркуе адпусьціць на гэту патрэбу 1500 руб. ды самі школы мяркуюць сабраць на гэту патрэбу каля 6000 руб. Такім чынам, матар'яльная дапамога бяднейшым вучням набудзе размах у тры разы большы, чым летась. Сотні вучняў будуць апрануты, абуты і атрымаюць сьнеданьне ў школе. Праўда, школам прыдзецца разгарнуць вялікую работу, каб сабраць 6000 рублёў, удзягнуўшы ў гэту справу бацькоў і грамадзкія арганізацыі. Некаторымі школамі ўжо праведзены зборы з больш заможных бацькоў на карысьць бяднейшых, пастаўлены платныя спэктаклі як сіламі вучняў, так і пры ўдзеле артыстаў тэатраў, закуплены сэансы ў кіно. Пры шмат якіх школах бацькі прымаюць удзел у арганізацыі гарачых сьнеданьняў, пашыцьця бялізны і вопраткі. Вучнеўскія арганізацыі і настаўнікі заняты абсьледваньнем хатніх умоў вучняў і выяўленьнем, каму найпатрэбней дапамога. Прымаючы ўсё гэта пад увагу, можна зазначыць, што матар'яльная дапамога ў бягучым навучальным годзе бяднейшым вучням будзе зроблена больш менш значная. Але і пры гэтай умове будзе зроблена толькі частка справы.

Другая частка—дапамога педагагічная, ня менш важная. Вывучэньне прычын другагодніцтва паказала, што найбольшая колькасьць другагодніцтва сярод дзяцей беднаты, сярод дзяцей рабочых, праца якіх нізка аплачваецца.

Аб гэтым сьведчаць і даныя аб колькасьці дзяцей беднаты (у процантах) па групах сямігадовай школы у 1928-29 годзе (на 5 лістапада): група 0—11 проц., 1-я група—11 проц., II-я група—13 проц., III-я група—15 проц., IУ-я група—11,7 проц., У-я група—8,8 проц., УI-я група—8 проц. і УII-я група—5 проц.

З гэтых лічбаў мы бачым, што колькасьць дзяцей беднаты да IУ групы ўзрастае, а з IУ групы да УII паступова падае. Паступовы ўзрост да IУ групы беднаты тлумачыцца накіраваньнем беднаты ў кожнай наступнай клясе на другі год у большай меры, чым вучняў другіх сацыяльных груп. Зьмяншэньне колькасьці дзяцей беднаты паступовае ад IУ да УII клясы тлумачыцца большым адсевам дзяцей гэтай сацыяльнай катэгорыі.

Адсюль вывад—дапамагчы бяднейшаму вучню гэта ня значыць выдаць яму толькі паліто, альбо чаравікі, калі рабіць сапраўд

ЛІТАРАТУРА-МАСТАЦТВА-КРЫТЫКА.

ЮРКА ЛЯВОННЫ.

Чысьцільшчык--грэк.

На злучэньні вуліц, дзе аўто і таксі,
Дзе гудзіць натоўпу размаіты бег,
Ён сядзіць над скрынкай—
і шарує ваксай,
І сьпявае ціха, пра сябе:
— „Мы, айсоры, *)
Мы жывем ля мора,
У нашым краі сонца і вясна...
Мы ня знаем гора,
Нас ня здужыць вмора,
Бо як вецер вольны кожны з нас"...
— „Падыходзь, любезны.
Жоўтыя пачысьцім!"..
Шэвелюра чорная, быццам воч...
На сьняданьне йгрушу з хлебам будзе грызьці.
— Гавары, айсоры, гавары са мной!
Раскажы—у вас там,
дзе прыбой хваляў,
Дзе ушёсы, ветры і блакіт—
Ці таксама шчасьцем паланяюць далі,
І няўпынны рух людзкой ракі?
Я Афін ня знаю,
як ня знаю мора,—
Што старая Грэцыя для мяне?
Я кажу—і шчыра, не глядзі, айсоры!—
Лепей мне вось тута, у родным старане...
... «— Ёсьць такая справа».—
Колькі?—
— «Ды—бяз таксы!
Атрымаць-бы грыўню на абед»...
. . . . . .
Ён сядзіць над скрынкай і шарує ваксай
І сьпявае ціха пра сябе:
— «Мы, айсоры,
Мы жывем ля мора,
У нашым краі сонца і вясна...
Мы ня знаем гора,
Нас ня здужыць вмора,
Бо як вецер вольны кожны з нас».

21-XII 1928 г.

*) Так завуць сябе яны.

Пра беларускі рабочы тэатр.

Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя вызваліла народы СССР з пад сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, даўшы ім поўную магчымасьць у адраджэньні нацыянальнае культуры, толькі не «наогул» нацыянальныя, бо ў кожнай нацыі ёсьць дзьве культуры, пралетарская і буржуазная, але: нацыянальнае па форме і пралетарскае па зьместу.

За гэты адрэзак часу, дзесяцігодзьдзе, мы маем вялізарнейшыя дасягненьні ў гэтай справе, справе культурнага будаўніцтва, а асабліва ў галіне тэатру. На сёньняшні дзень побач з Акадэмічнымі тэатрамі, якія дасягні такіх вялікіх посьпехаў у галіне стварэньня мастацкіх каштоўнасьцяў («Цар Максіміліян»), маем дзесяткі і сотні самадзейных драматычных гурткоў, у якіх працуе амаль выключна моладзь, сярод іх маюцца таленавітыя адзінкі, якія таксама укладваюць нешта сваё ў скарбніцу тэатральнае культуры. Але мы чамусьці мала зьвяртаем на іх увагі, а займаемся у большай сваёй частцы толькі прафесыйным тэатрам. Трэба ў гэтай галіне штосьці рабіць, бо як нам вядома, рабочая маса значную частку свайго бюджэтнага часу (васьмігадзінны адпачынак), праводзіць у клюбах, перад якімі выступаюць гэтыя гурткі. Нам здаецца, што варта было б, нават, арганізаваць спаборніцтва паміж пасобнымі гурткамі, што значна ўзьніме якасьць пастановак, а таксама зацікавленасьць, як з боку удзельнікаў, гэтак і гледачоў. Але аб гэтым падрабязней другі раз.

Зараз мы маем на ўвазе адзін з такіх гурткоў, які ўжо аформіўся як рабочы тэатр, атрымоўвае невялічкую дзяржаўную дапамогу і сваёй пастановкаю: «Босыя на вогнішчы» М. Чарота бязумоўна зрабіў уклад у скарбніцу тэатральнае культуры. Гэтую пастаноўку ня брыдка, каму хочаш паказаць, яе можна сьмела раіць клюбам, яе трэба раіць усім школам. Дый шэраг іншых спэктакляў. («Бацька і сын», «Гірш з воучага логу», «Пастыкуе», «Будні») з задавальненем глядзіць рабочы гледач, а гэта сьведчыць што такі тэатр нам крайне патрэбен, бо ён хоць частькова, але вызваляе клюбнага гледача ад розных гастралёраў, якія за апошні час (асабліва ў округах), літаральна наводняюць рабочую сцэну.

Склад актораў гэтага тэатральнага калектыву—выключна моладзь, якая рвецца аўладаць цалкам тэатральнымі ведамі і аўладае бо напружана працуе над сабою. Рэжысэрскую працу вядзе Ф. П. Ждановіч, які аддае весь вольны час, укладвае ўсю энэргію для таго, каб тэатр жыў і разгортваўся. Аднак гэтага мала, тэатру патрэбен пастаянны платны рэжысэр, патрэбен дагляд, патрэбна належнае ідэолёгічна-мастацкае кіраўніцтва.

Якія-ж перад ім стаяць задачы?

Першая задача—адказаць на запытаньні, якія сёньня хвалююць беларускага рабочага, адбіць яго жыцьцё, барацьбу у мінулым, барацьбу за новы быт, далейшае яго разьвіцьцё, як гегемона.

Другая задача—акторскі склад тэатру павінен аўладаць тэатральным мастацтвам, удасканальваць яго, сваю творчасьць укладваць у такія формы, якія-б былі сугучны нашай эпосе.

Трэцьцяя задача—тэатру трэба больш прыслухоўвацца да запатрабаваньняў пралетарскай грамадзкасьці. Пры выкананьні гэтага, тэатр зьявіцца магутным культурным фактарам, сродкам, які будзе арганізоўваць масы, даваць ім бадзёрую зарадку для будаўніцтва сацыялізму.

Пры тэатры неабходна скласьці пастаянную раду з прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый, а таксама неабходна ўвесьці рабочых ад буйнейшых фабрык і заводаў, на якой абгаварваць пытаньні рэпэртуару.

Усё гэта можна будзе выканаць толькі тады, калі кіруючыя органы зьвернуць належную ўвагу, дапамогуць маладому беларускаму тэатру, які прарабіў ужо значную работу на абслугоўваньню клюбнага гледача.

Дый саюзу Рабіс час ужо падумаць аб гэтым тэатры, бо нельга-ж адрабіцца толькі вылучэньнем свайго прадстаўніка ў мастацкую раду.

Дык больш увагі моладзі!

І. Гурскі.

АБ АТРУТНАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

Яшчэ ў 1923 годзе харкаўскае выдавецтва „Путь просвещения" выдала дзіцячую кнігу «Што расказвалі Пятрусю яго ірыяцелі». Гэта нек лькі казак нямецкай пісьменьніцы Гэрмініі Цурмулен, пераложаных па расійскую кову. Некалькі тысяч гэтай кніжкі разышлося па ўсяму Саюзу. Яе чыталі дзеці ў хаце, настаўнікі чыталі дзецям у школах. Кніга карысталася поспехам і вось гэту кнігу харкаўскае выдавецтва выпускае другім выданьнем. Зноў тысячы і дзесяткі тысяч дзяцей слухаюць і чытаюць цурмуленаўскія казкі.

Гэтымі днямі паступіў у выдавецкі аддзел БДВ пераклад гэтых казак на яўрэйскай мове. Каб заказаць мастаку ілюстрацыі да гэтай кніжкі, я пачаў праглядаць малюнкі расійскага арыгіналу і раптам на старонцы 16-ай бачу... чорта! Сэнага „сапраўднага" папоўскага чорта—з рагамі, капытамі, хвастом і з вялізнымі абцугамі у руках. На суседняй старонцы—спалоханы хлопчык сядзіць на ложку і з жахам глядзіць на манашку, якая моліцца...

Гартаю далей—яшчэ лепей: у пекле, у вялізным полымі гарыць чалавек і крычыць, падняўшы рукі ўгору, а яго з усіх бакоў абступілі чэрці, і колюць вілами ў бок і сьпіскаюць вялізнымі абцугамі. Зусім так як на сярэднявяковых паркоўных малюнках для народных мас. Чытаю тэкст. Да хворага хлопчыка, які зламаў сабе нагу, коўзаючыся на коўзанках (своеасаблівая агітацыя за фізкультуру! І. Ц.), прышла манашка і кажа: «Гэтую пакуту паслаў табе бог, ты мусіш цярпліва зносіць... Ты штодня молішся богу?—«Не», шчыра адказаў маленькі Пятрусь. Сярэдзітая жанчына злосна усьміхнулася: „О-ь бачыш, таму ты ўпаў і зламаў сабе нагу". Хлопчык супярэчыць, але манашка супыняе яго і кажа: „Господь дабе пакараў, таму ты і ўпаў. Ці ведаеш ты куды адпраўляюць дрэнных людзей, якія ня моляцца богу?" (для большага страху «бог» надрукаваны з вялікай літары І. Ц.)... Іх пасылаюць у пекла. Там яны засуджаны на вечныя пакуты і гэтыя дзеці вечна гараць у агні і крычаць ад болю, а чэрці вярэць іх цела распаленымі абцугамі. У цябе баліць нага, а калі ты трапіш у пекла, ты будзеш пакутаваць куды болей. Тваю нагу таксама пашлюць у пекла, бо яна ня сочыць за тым, каб ты маліўся"... Калі манашка пашла, «маленькі хлопчык ляжаў і калаціўся ад страху. Яму было страшна трапіць у пекла, вечна гарэць і зносіць там пакуты. І бедная нага таксама трапіць у пекла! Але-ж чаму? Яна-ж гэткая добрая і цалы дзень працуе. Доўга думаў Пятрусь пра чарцей і пра пекла».

Далей аўтар выводзіць на сцэну бутэльку, якая пачынае рагатаць і праводзіць в Пятрусём „антырэлігійную" гутарку такога зьместу.

«Ты такі самы дурны, як і тая жанчына. Я ведаю, што такое пекла; яго стварылі людзі, але ня бог. Дзеці і дарослыя трапляюць у гэтае пекла, таму, што яны—бедныя, а не таму, што яны ня моляцца богу». Далей ідзе апісаньне ў самых жахлівых фарбах шкляной гуты, дзе „вялізная печка ўся чырвоная ад агню і падобна да вогненага мора (!)", дзе дарослыя і дзеці гінуць ад сьпякоты («бедныя людзі сачаць і ледзь дыхаюць ад гарачыні»). «Так, мілы Пятрусь, вось дзе сапраўднае пекла!—пагэтычна выгукае бутэлька і злосна сьмяецца.—„Бог тут ня мае дачыненьня. Гэта людзі пасылаюць адзін аднаго ў гэтае пекла". Пасьля ідзе прымітыўнае тлумачэньне, што чэрці—гэта багатыя людзі, «у якіх няма ні рогаў, ні хвастоў, (а ў чарцей ёсьць? І. Ц.) і яны носяць шаўковыя прыгожыя гарнітуры, а абцугі, якія ёсьць у іх (!) называюцца пэндзай».

Калі Пятрусь падае рэпліку, што ён нічога не зразумеў (малайчына, Пятрусь! І. Ц.), бутэлька, яна-ж Цурмулен, кажа: «гэта залежыць ад капіталістычнае выторчасьці», а калі Пятрусь просіць прабачэньня ў Цурмулен і кажа—„гэтыя цяжкія словы мне незразумелы", бязьлітасная Цурмулен тлумачыць далей: «Гэтыя словы значаць, што той, у каго ёсьць грошы зьяўляецца панам над тым, у каго іх няма. Я не скажу, што ўсе багатыя—чэрці, але яны усе робяць так, як чэрці... Бедныя людзі ня маюць багатых бацькоў і рады, калі ім удасцца што-колечы зарабіць на жыцьцё. Ад страху страшць кавалак хлеба, яны прымушаны падпарадкавацца багатым. Ты гэта зразумеў?.. А на сьвеце ёсьць добрыя, разумныя людзі. Яны змагаюцца проці гэтага... Гэтыя добрыя разумныя людзі называюцца сацыялістымі, камуністымі. Запамятай гэтыя словы. Вось і ўся казка. Я знарок перапісаў амаль усесь тэкст, каб паказаць, якой страшнай ат утаў поць нашых дзяцей. Трэба-ж падумацца да такой антыпэдагагічнай бязглуздзіцы! Тут відзе ў цэлай кнізе няма аніводнага слова, ні нават цені аб тым, дзе ўсё гэта адбываецца. Апісаньне падзей ва ўсіх казках падасцца так, што кожны, асабліва дзіця, зразумее нібы ўсё гэта ёсьць у нас. І фабрыкі, якія горш за пекла (вось чаму Пятрусь у канцы кнігі крычыць: «мая мама больш ня пойдзе на фабрыку!» і паны, якія мардуюць рабочых і іх дзяцей, і рабочыя, якія на акцізных заводах «падаюць мёртвыя на зямлю» ад атрутнае пары (стар. 25), і фабрыканты, якія будуюць фабрыкі без вакон і вэнтылятараў (стар. 26) такія «мудрыя» сэнтэнцыі: «хто-ж ведае калі людзі вразумеюць, што так жыць нельга? Людзі стогнуць пад ярмом ужо многа соцен год; яны яшчэ не адалелі сваіх фабрыкантаў. Дый як можна змагацца з імі? Багатыя — дужыя і ўлада ў іх руках»...

Па ўсіх старонках размазана столькі сантымэнтальна-буржуазных «ах'аў» і сьлёз, што нудзіць. Рабочыя—усюды маюць адзін эпітэт «бедныя» або «няшчасныя», увесь час іх б'юць і ганяюць таўставузыя паны і пані, «адзетыя ў шаўковыя адзеньні і падобныя да бога» (стар. 12). Прыгожыя пані увесь час балююць, жывуць у 20 пакоях, і «ня думаюць аб бедных дзецях, якія страцілі бацькоў», «ядуць у часе сьнеданьнем болей, як іншыя ў часе абеду»... Затое ёсьць «стары добры чалавек, які ўвесь час піша добрыя кнігі, каб людзі былі дабрэй адзін аднаго»... Сярэд уся кніга да краёў перапоўнена падобнай і яшчэ горшай балбатнёй. Больш шкодная кнігі для дзяцей нельга і выдумаць. І аднак... яўрэйскі аддзел Пар. Каміс. Асьветы БССР даручае перакласьці яе на яўрэйскую мову, а калі пераклад гатовы тав. Мар'ясіна піша ў Белдзяржвыдавецтва такую паперку:

„Пераклад зроблены добра, папулярны мовай. Казкі годны для дзяцей чалоднага ўзросту". А каб было мацней і выдавецтва паверыла ў „годнасьць" гэтай кнігі, на адвароце паперкі стаіць: „Згодна рэцэнзіі т. Мар'ясінай—друкаваць. За старш. камісіі па дзіч. літаратуры А. Попель".

Калі я спытаў настаўніка т. Равіна, які рабіў пераклад, дзе выкапалі гэтае буржуазна-сантымэнтальнае барахло, ён адказаў: «Што вы, гэта ходкая дзіцячая кніга ў нашых школах... Ён карыстаюцца пры выказданьні комплексаў». Што ён шырока карыстаюцца відаць на квізе: зачытана да шматкоў і на ён стаіць пячатка «17 сямёхгадовай савецкай працоўнай школы». Астаецца толькі адно: прасіць галоўліт канфіскаваць паўсюды гэту дзіцячую кнігу за яе антыпэдагагічны, палітычна шкодны, а знача бязумоўна небясьпечны для дзяцей зьмест.

Ю. Цьвікевіч.

Кіно-вытворчасьць Украіны.

З бюлетэняў Усеўкраінскага фото-кіно ўпраўленьня мы дазнаемся, што за апошнія месяцы ВУФКУ вельмі шырока разгарнула сваю кіно-вытворчасьць, асабліва на новай сваёй кіеўскай фабрыцы.

У сьнежні месяцы 1929 г. ВУФКУ выпусьціла два вялікіх мастацкіх кіно фільмы—«Бенефіс клоўна Жоржа» і «Дзьве Сілы». У першым паказана дзейнасьць цырковага артыста—чырвонаармейца ў часы грамадзянскай вайны. Карціна прасякнута сапраўдным рэвалюцыйным патосам. Надзвычайна добрая аператарская работа. У карціне ёсьць некалькі цікавых сцэн з удзелам зьвяроў. У галоўнай ролі артыст Недемскі, вядомы па высока-мастацкай карціне «Звезвігора». Другі мастацкі фільм выпушчан да перавыбарчай кампаніі.

За гэты-ж месяц на кіеўскай фабрыцы зроблена 7 агітацыйных фільмаў.

Заканчваецца вялікі навучальны фільм «Культура цукровага бурака», вядзецца работа над санітарна-агітацыйным фільмам «Бережы вока», а таксама навуковы шэраг мастацкіх цікавых карцін выйдзе ў студэнці з Адэскае кіно-фабрыкі. ВУФКУ прыняло заказы і прыступіла да выкананьня шэрагу культурфільмаў, па заданьням Наркампрацы—з вугольнай і металёвай прамысловасьці. Некалькі сэрый па заданьням кампрацы, камісарыяту аховы здароўя і іншых дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый.

У працы стварэньня гэтых карцін прымаюць удзел віднейшыя навуковыя работнікі розных галін.

Для работы ў мульты-плікацыйным габінэце кіеўскай кіно-фабрыкі, запрошан вядомы маскоўскі мастак Фрыдберг-Армен. Для пастаноўкі мастацкіх фільмаў запрошан вядомы рэжысэр Рожаль (пастаноўшчык «Саламандры»).

У канцы лютага г. г. з Адэсы на лёдаколе «Лідтке», які адпраўляецца ў кругавое падарожжа на востраў Урангеля праз Сярэдзеннае мора, Індыйскі і Вялікі Акіян, трапікамі да палярных краёў ВУФКУ накіроўвае рэжысэра Г. Грычара і аператара С. Радзіхоўскага.

З такім буйным, такім цікавым кіно-прадпрыемствам у СССР як ВУФКУ нажаль прыходзіцца знаёміцца па бюлетэням чамусь-ці на экране кіно-тэатраў БССР мы ня бачым ніводнае карціны вытворчасьці ВУФКУ. Гэта вялікі недапусьцімы прабел. Ведамсьцьвенная грызьня, калі такая мае месца, павінна быць адкінута. Дзьве савецкія, братнія рэспублікі павінны дагаварыцца. Культурныя задачы ў нас адны.

Вас. Баз.

МАКСІМ ЛУЖАНІН.

Дарога.

Быццам рукі дзяўчыніны шоўк разматалі
і разьвесілі ў пасмах ад слупоў да слупоў.
Пералівамі поле і сьнежныя хвалі,
толькі зоры блішчаць з-пад цяжкіх капытоў.
Узрастае салодкая ў сэрцы трывога,
коні мчаць, ня спыняюць з сяла да сяла...
І такою прыгожаю тчэцца дарога,
быццам зроду дасюль на зямлі ня было.
Вечна хочацца к зорам... Ды зор ня прыгорнеш!
Ці таму спавіваецца сэрца тугой,
што ня будзе спачыну ў шалёнай пагоні,
за вясёлаю радасьцю без берагоў.
І заўсёды на людзях гаворка такая—
нечаканая праўда—нязнанай журбы:
колькі постацей кволых душа сустракае,
а чамусьці аднэй даражэйшаю быць!
Сустракаю вясну ў дыямэнтавым полі,
колькі шчасьця і радасьці сонца бруіць!
І цярусячы гоман бясконцае волі,
ціха лашчацца ясныя сьветлыя дні.
І здаецца—зыбаюцца белыя хвалі,
зоры блішчуць ясьней праз капытлівы пыл...
Быццам рукі дзяўчыніны шоўк разматалі
і разьвесілі пасмы з слупоў на слупы.

Случчына.

За новую карысную п'есу.

(Ліст з м-ка Старобіна).

Пытаньне аб карысных новых п'есах яшчэ да гэтага часу не ўрэгулявана па мястэчках БССР. Тая п'еса, якая выпуўле сацыяльную барацьбу нашай эпохі, яшчэ не заняла належнага месца ў мястэчковых пастаноўках. Спэктаклі павінны адыгрываць вялікую культурную, выхаваўчую ролю. Безумоўна, што старыя дарэвалюцыйныя п'есы ў большасьці ніякай культуры ня ўносяць, хоць яны часам і па густу некаторай частцы мястэчковага жыхарства. Нажаль драмгурткі часта бяруць стаўку на вялікі абор і не зьвяртаюць увагі на каштоўнасьць п'есы, наколькі яна адпавядае сучаснасьці. А насельніцтва прымае новыя п'есы. Возьмем к прыкладу—драмгурток пры пардоме ў м. Старобіне паставіў п'есу (самі яе і напісалі) «Атаман Муха», якая выяўляе барацьбу партызан у беларускіх лясох. Яна мела надзвычайна вялікі посьпех. Білеты вельмі ахвотна разьбіраліся. П'есу ставілі некалькі разоў. З вялікай цікавасьцю глядзеў яе селянін, яна была яму блізкай і зразумелай.

«Цыганка Занда», «Урысь Акоста» і г. д.—гэтыя п'есы, якія ставіліся ў Старобінскім тэатры, а мо' і ў іншых мястэчках павінны ўступіць месца больш адпавядаючым нашаму часу п'есам. Загадчыкам пардамоў, пры якіх працуюць драмгурткі, на трэба толькі гаварыць, што няма новых, цікавых п'ес. Трэба толькі хацець і іх можна адшукаць.

Разам з гэтым неабходна нагаварыць аб цэнах на білеты. Ад 70 к. да 20 к. білет (як гэта звычайна бывае ў Старобіне)—зьяўляюцца высокімі. Таксама неабходна павялічыць лік беларускіх пастановак, а не расейскіх. Толькі пры выкананьні усяго гэтага, наш мястэчковы тэатр стане сапраўдным праваднікам культуры.

Прэч старое! За новую, карысную п'есу, вось лёзунг сёньняшняга дня мястэчковых драмгурткоў.

М. Варшал.

Сусьветная літаратурная хроніка.

Дзьве драмы Д'Анунцыо.

Д'Анунцыо напісаў дзьве драмы: «Сон весьняй раніцы» і «Сон восеннага вечару».

Тры аўтары аповесьці.

Дж. Лёндан, Андрэ Сальмон і Фэрдынанд Дзівуар напісалі сэнсацыйную аповесьць пад назвай „Падзеі аднаго злачынства". Лёндан і Сальмон зьяўляюцца найзнанымі судовымі справазнаўцамі.

Помнік Пятраркі і рымскі амфітэатр.

У Арэцо ў Пюскаці, дзе нядаўна адчынілі аграмадны помнік знаменітага паэта італьянскага рэнэсансу Пятраркі, распачаты работы для адкаваньня рымскага амфітэатру, які будзе адбудован у сваім даўнім выглядзе.

«Флёрыян з Вялікай Глушы».

Пад такой назвай у Польшчы выйшла нядаўна з руку аповесьць вядомай польскай пісьменьніцы Марыі Радзевіч. Як і ва ўсіх іншых творах М. Радзевіч, і ў „Флёрыяне" адчуваецца глыбокая сымпатыя і нават улюбёнасьць аўтаркі да сфэр, з якіх яна паходзіць,—да польскай шляхты ва «Усходніх Крэсах», г. ё. Зах. Беларусі, а часта,—яшчэ выразьней пасьля вайны,—абрушлівасьць да акружаючых беларускіх „гадаў".

«Тутэйшы аўтахтон ня мае паняцьця аб трох рэчах, якія мы (красавыя абшарнікі. Аўтар) здабылі ў службе Польшчы: гонар, сумленнасьць і багатырства да ахвярнасьці»—вось выразнае крэдо аўтаркі. М. Радзевіч ідэалізуе польскую крэсавую шляхту і ненавідзіць беларускую масу.

„Флёрыян"—гэта звон мястэчка на „Крэсах" Беларусі, зьяўляецца нібы сымбалем магутнасьці і вытрывалаасьці гэтай зьдзічалай крэсавай шляхты, якая, як мы гэта добра ведаем, ніякай цывілізацыі, ніякай польскай культуры з сабою на „Крэсы" ня прывезла, а над беларускай культурай і асьветай толькі і знае, што зьлазкуецца.

Як і іншыя творы аўтаркі «Флёрыян з Вялікай Глушы» цікавы і карысны для нас сваім чыста клясавым польска-шляхецкім падыходам да балючых у Зах. Беларусі палітычных, эканамічных і культурных вымаганьняў беларускага народу. Па «Флёрыяну» можна бачыць, з якімі „культурнымі" зубрамі прыходзіцца весьці справы беларускаму народу ў Польшчы і чаго ад іх можна чакаць.

АДКАЗЫ АЎТАРАМ.

Алесю Чымбуру.—Вашы вершы адасланы ў кансультацыйнае бюро Белавіт'у, Менск, вуліца Карла Маркса, клюб К. Маркса.

Ад. Штаньюну.—Зборніка вашых вершаў выдаць ня можам, хоць ён і з фатаграфічнай карткай. Можам зьвярнуць вам, калі зойдзеце.

Я. Пятухоўскаму, Е. Войвічу, Я. Канлеўскаму, Янку Дубку, Н. Сацкаму, Я. Лапцёву (эпюх), Луку яну Пазарожніку, Овану, Д. Цедзяренку, Янку Лукашонку—надасланых вамі вершаў друкаваць ня будзем, бо яны слаба напісаны.

А. Пр.—П'есу друкаваць ня будзем.

ЯСНАЯ ПАЛЯНА.

(АБРАЗОК).

Прасторны пакой нардому буйнай суко най фабрычкі «Чырвоны Кастрычнік» застаўлены: шафамі, паліцамі, этажэркамі і сталамі.

Сталы заняты газэтамі, а ў шафах, на паліцах і этажэрках добра падабраны і ў прыгожым парадку разложаны кнігі. Кніг многа, і да іх страватасьці вочы любоўна і ўважна разьбягаюцца па ўсяму пакою. На сьценах пакою, чыей-сьці рупнай рукой, разьвешаны розныя плякаты і чырвоныя сьцягі са срэбнымі і залатымі на іх лёзунгамі і надпісамі.

Парадак у пакоі і цішыня. Поўны супакой, ніводнага голасу ня чутна. Толькі ў канцы яго за канторкай—ніякай і няпрыкметнай—рыжым вожыкам выглядае пасярэбраная кніжным пылам, галава загадчыка бібліятэкі. Я падыходжу да яго.

— Дзень добры дзядзька!

— Дзень добры!

— Што-сь пуста ў вас і ціха, як у турме?—дзіўлюся я.

— Ціха?—Цішыня гэта добра... Марыць добра ў цішыне, не перашкаджае ніхто, я ўжо прывык да гэтага—лавіна адказаў ён незвычайна.

— Мне вось, дзядзька, пяты том Талстога!

— Талстога? пяты?—зараз адну хвілінку. У нас ёсьць і пяты, і шосты, усё ёсьць многа чаго ёсь...

— Ну, а як тыя,—спадабаліся? Мы, ведаеце, волгукі зьбіраем, так сказаць,—вывучаем густ і патрэбу сучаснага савецкага чытача.

— Вось, калі ласка, атрымайце!—Скінуўшы з сябе лянівую дрымоту, загадчык ажывіўся і яго роўная з невялікімі пазамі гутэрка журчала, цвяр, нібы цяхан, лясная захаваная ў траву і карнявішчы—крынічка.

Я забраў з рук загадчыка кнігу і засоўваючы яе над паху заўважыў, што яна зьлегку абрасла пылам і што я ўжо ўсьпеў ёю запоўнаць свой гарнітур.

— Э, дзядзька! з такімі адносінамі да кніг, яны ў вас не ў славе і мохам абрастуць, вя-то пылам... Выходзіць, што ідучы да вас і шчоткай яя шкодзіла-б запасацца—нядала пажартаваў я, але гэты мой жарт не пакрыўдзіў загадчыка, ён толькі ледзь зьдзіўлена разьвёў рукамі і ціхім сумам адказаў:

— Ну што-ж рабіць, калі ўжо, вось, в самае вясны ўсе мае чытачы разьбегліся на зелень, па кветкі...

Зваць вясна мае над моладзьдзю больш моцную сілу, чым мая пыльная мудрасьць кніг.

— Бывайце здаровы!—і абтрасаючы гарнітур я накіроўваўся да выхаду.

II.

На ганку мяне ласкава спаткала празвычайнае летняе сонейка. Са сьмехам яно кінула мне ў вочы цалы сноп сваіх яркіх праменьняў. Я прыжмурыўся, ледзь міжвольна, усьміхнуўся яму ў адказ і спусьціўся на мяккую мураўку.

Вакол Нардому, на абшырнаму пляцу, які зарос жоўтым пахучым рамашкам і мяккай муравой, як дзікія козачкі на сваіх стромкіх, адкрытых вышэй за калена ножках — лёгка пстрыкалі палымі карагодамі дзяўчаты. Яны весела, але больш штучна ўсьміхаліся сваімі ружовымі вахвараванымі парфумай вуснамі і шчочкамі, а падведзенымі цёмнай смугой вочкамі, хоць і ўкрадкай, але часта страляілі ў бок хлапцоў. А хлопцы нахохліўшыся пятухамі—з задзерам кружыліся каля іх і той сёй, нязнач, нібы гарохам сыпалі жартамі, а часта і скаромнымі двумысныкі слоўцамі у гурбу дзяўчат, тыя пасіскваілі і хіхікалі.

Паважна, нібы квактухі з пісклятамі, расьпусьціўшы калясосу свае баніты, да паловы адкрыўшы пульхныя, дрыгвяныя грудзі—вадзілі свае выважкі недаткненныя дамы «Восьмы я»—гэта тутэйшая інтылегэнцыя—жанкі начальствуючых асоб і вяршкоў фабрыкі.

Зрэдку, паміж гэтага стрыкатага натоўпу праходзілі пажылыя і старыя рабочыя, яны, як відаць сьпішаліся да сваіх кватэр і незважаючы ні на летняе сонейка, ні на шумна-крыклівыя карагоды моладзі—стараліся ісьці роўна па сваёй ўжо пакрыўленай сьцежцы і зд гэтага стараньня ногі іх самі сабой рабілі выкрутасы, а язык што-сь манатонна і глуха мармытаў сабе пад нос.

Я раз другі прайшоў сярод натоўпу, але аглушаны смехам і тлумаку галасоў, ледзь неўзаметку для сябе падаўся на пляцу ближай да развалена-га старага плоту. Тут густа разрослася мяккая зялёная муроўка і жоўты пахучы рамонак.

Ласкавыя подыхі слабога ветрыку разам з чмяліным гудам галасоў данесьлі да мяне пахі распаранага потнага цела і парфумы. Пахі цела і парфумы зьмешваліся з прыемным пахам рамонку, і цягучым тонкім струменем лезьлі ў нос—казыталі і дражнілі нэрвы.

